№ 37 (491) 13 кастрычніка 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

210 пратэстантаў трымаюць галадоўку, патрабуючы спыненьня рэпрэсій супраць сваёй царквы. Старонка 5.

## Вялікі пост



Юлія Дарашкевіч

### У НУМАРЫ

**Неймаверныя абвінавачаньні супраць Красоўскага**



Паўла Красоўскага арыштавалі, бо ён мусіў стаць наступнікам Дашкевіча? **Старонка 6.**

**Стагодзьдзе «НН» ідзе па краіне**

Рэпартажы зь юбілейных вечарынаў у Менску й Полацку. **Старонкі 3—4.**

**Навіны даўнія і сёньняшнія**

Што новага на Вялейшчыне й Пастаўшчыне было 100 гадоў таму і ў 2006 годзе? Пішуць Мікола і Ўсевалад Сьцебуракі. **Старонка 24.**

**Кіслая глеба**

Піша Павал Севярынец. **Старонка 14.**

**«Рускія» здаюць пазыцыі ў Латвіі**

Правал прарасейскай партыі на выбарах у краіне Балтыі. **Старонка 22.**

**Швайцарскі футбол**

Новае апавяданьне Паўла Касьцюкевіча. **Старонка 27.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

## У нумары

### люстра дзён

Вялікі пост ........ 5
Красоўскага арыштавалі таму, што ён мусіў стаць наступнікам Дашкевіча? ........ 6
Баршчэўскі, Арлоў, Мілінкевіч: «Дашкевіч і Красоўскі вытрымаюць» ........ 7
Неймаверныя абвінавачаньні супраць Красоўскага ........ 7
Сяргей Лаўроў: сытуацыя польскай меншасьці ў Беларусі — як беларускай у Латвіі ........ 8
Міліцыянты прыйдуць да кожнага беспрацоўнага ........ 8
Выбары прызначылі на 14 студзеня ........ 8
«Усе асобнікі кнігі Сіпакова мусяць быць зьнішчаныя» ........ 9
Дашкевіч сядзіць у камэры з хворымі на сухоты, гепатыт і СНІД ........ 10
Менск: выбух у школе ........ 10
Флэш-моб сарваўся, але лісты пайшлі ........ 10
У Астрэйкі нарадзілася дачка . 11
Мілінкевіч будзе езьдзіць ........ 11
Пасьля страйку сьціхла «Новае радыё» ........ 11
Мілінкевіч выказаў спачуваньне з нагоды сьмерці Паліткоўскай . 11
Аб усім патроху ........ 12
Хроніка ........ 14

### камэнтары

Павал Севярынец. Кіслая глеба 14
Аляксандар Класкоўскі. Выбары гуртам і ўраздроб ........ 16
Віталь Тарас. Ці хочам мы татальнай мабілізацыі? ........ 18
Аляксей Шэін. Спачатку — палітычных, за імі — рэлігійных 20
Багдан Асадчук. Юшчанка як Гамлет ........ 23

### гумар

Лёлік Ушкін. Дажынкі-2006 да нашай эры ........ 17

## Улады працягваюць рыхтаваць закрыцьцё «Нашай Нівы»

У красавіку г.г. газэта «Наша Ніва» атрымала ліст за подпісам намесьніка старшыні Менскага гарвыканкаму М.Ціцянкова ад 10.04.2006, у якім гаварылася, што «разьмяшчэньне газэты «Наша Ніва» ў горадзе Менску немэтазгоднае». На накіраваную ў гарвыканкам скаргу газэта адказу не атрымала.

Варта адзначыць, што Закон аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі не прадугледжвае ўзгадненьня разьмяшчэньня выданьняў зь мясцовымі выканаўчымі органамі. Акрамя таго, заканадаўства не ўтрымлівае паняцьця «мэтазгоднасьці». Таму юрыдычна ўсё гэта не вытрымлівае крытыкі. Тым ня менш, пачынаючы з таго часу, пачаліся мытарствы газэты.

Дагавор на арэнду офісу газэтай быў разарваны арэндадаўцам. Выдавец газэты знаходзіў новы офіс, але, як толькі інфармацыя пра новы адрас разьмяшчэньня газэты падавалася, у адпаведнасьці з заканадаўствам, у Міністэрства інфармацыі і ўпраўленьне юстыцыі Менскага гарвыканкаму, на працягу лічаных дзён і новы арэндадаўца без тлумачэньня прычынаў разрываў толькі што заключаны дагавор арэнды.

Гэтая сытуацыя паўтарылася ўжо чатыры разы, з арэндадаўцамі розных формаў уласнасьці. Кожнаму ясна, хто прымушаў іх у паніцы разрываць выгадныя дамовы.

Адсутнасьць юрыдычнага адрасу дае падставу для адкліканьня пасьведчаньня аб рэгістрацыі газэты. Усе ганеньні «Нашай Нівы» сёлета даюць падставу меркаваць, што ўлады працягваюць рыхтаваць закрыцьцё газэты.

Няхай уціск беларускай мовы і культуры мацней згуртуе нас усіх, тых, што гавораць, і тых, што маўчаць, вакол гэтых найбольшых нацыянальных каштоўнасьцяў.

## У адной з крамаў «Нашу Ніву» канфіскавалі

5 кастрычніка тры асобы, якія назваліся супрацоўнікамі КДБ, канфіскавалі ў памяшканьні крамы «Сотвар» у Менску 15 асобнікаў газэты «Наша Ніва» №36, якія прадаваліся там у адпаведнасьці з дамовай. Прычым дадатак да асартымэнтнага пераліку гэтай крамы з указаньнем газэты «Наша Ніва» быў зарэгістраваны адміністрацыяй Першамайскага р-ну Менску.

Тыя асобы не ўказалі ні фактычных, ні прававых падставаў канфіскацыі газэтаў. Свае дзеяньні яны абгрунтавалі тым, што «НН» нібыта забаронена для распаўсюду ў Менску, што не адпавядае сапраўднасьці, бо «Наша Ніва» зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі.

Канфіскацыя не была афармленая дакумэнтальна ніякім актам.

Арт.25 частка 6 Закону «Аб друку і другіх сродках масавай інфармацыі» ўстанаўлівае, што перашкоды распаўсюду прадукцыі сродку масавай інфармацыі, які ажыцьцяўляецца на законных падставах, не дапускаюцца. На падставе гэтага Рэдакцыя зьвярнулася ў Пракуратуру з просьбай устанавіць асобаў, вінаватых у канфіскацыі, і прыцягнуць іх да вызначанай Законам адказнасьці, а таксама вярнуць асобнікі. Аднак вялікае надзеі на тое, што гэта будзе зроблена, мы ня маем.

І гэта толькі адзін з эпізодаў штодзённага ціску. У такіх умовах цяпер выдаецца і распаўсюджваецца «Наша Ніва».

БМК

## ДА ЎВАГІ ПРЫХІЛЬНІКАЎ СЭРЫІ «БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР»

У верасьні гэтага году ў продажы зьявілася кніга Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на плянэце Зямля», выдадзеная пад вокладкай і тытулам сэрыі «Беларускі кнігазбор». Паведамляем, што да выпуску гэтага выданьня распрацоўшчык і праваўладальнік сэрыі і таварнага знаку «Беларускі кнігазбор» Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне «Белкнігазбор» ніякага дачыненьня ня мае. Кніга выдадзена ТАА «Харвест» бяз нашага ведаму і дазволу і не адпавядае канцэпцыі і прынцыпам сэрыі.

**Управа МГА «Белкнігазбор»**

# «Жніво вялікае, а работнікаў мала»

Сьвяткаваньне 100-годзьдзя «Нашай Нівы» ў Полацку: у адрозьненьне ад менскай публікі, палачане сьпявалі «Не загаснуць зоркі ў небе» стоячы.

У пятніцу, 6 кастрычніка, ў парафіяльнай залі касьцёлу Сьвятога Андрэя Баболі ў Полацку адбылася сустрэча чытачоў з рэдактарамі газэты «Наша Ніва» ў рамках сьвяткаваньня стагодзьдзя газэты.

Зь Менску былі Андрэй Дынько і Андрэй Скурко, зь Віцебску — сталы аўтар «НН» і часопісу «ARCHE» філёзаф Пётра Рудкоўскі. Імпрэза прайшла, дзякуючы стараньням навапалацкай пісьменьніцы Ірыны Жарнасек.

Гаворка адразу пайшла ў надзвычай зычлівым тоне. Андрэй Дынько расказаў пра ўражаньні ад падобных сустрэчаў у Бэрліне і Менску. Чытачы цікавіліся, ці назаўсёды мінуў у беларускай палітыцы і ва ўсім жыцьці час рамантызму. А.Дынько тлумачыў, што мінуў час будаваньня паветраных замкаў. Адзін з чытачоў запытаўся пра артыкул Валянціна Акудовіча «Бяз нас». Рэдактары першай беларускай газэты як маглі аспрэчвалі высновы Акудовіча.

Пётра Рудкоўскі, кажучы пра юбілей «Нашай Нівы», згадаў словы зь Бібліі, што «жніва шмат, а работнікаў мала». Бо не заўсёды хапае патрэбных людзей, каб зь іх дапамогай можна было заняць вакантныя цяпер дзялянкі беларускасьці. Гэтыя словы пацьвердзіліся, калі адзін з прысутных запытаўся, ці не мяркуе «НН» зрабіць нейкі прамежкавы праект паміж «Газэткай дзеткам» і «Левым вокам». Андрэй Скурко адзначыў, што калі будуць канкрэтныя прапановы, то абавязкова іх разгледзіць, а пакуль няма людзей, што маглі б заняць гэтую нішу. Ён таксама зрабіў невялічкі экскурс у гісторыю газэты, зрабіў паралелі між тым і сёньняшнім выданьнем, працытаваў Аляксандра Ўласава.

Некалькі песень прасьпявала бардка Лера Сом. Са словам выступіў паэт Алесь Аркуш, які адзначыў, што для беларусаў «Наша Ніва» зьяўляецца нацыятворчай газэтай. Цудоўныя духоўныя гімны выканаў хор навапалацкае каталіцкае парафіі.

На сустрэчу зьехаўся дзясятак ксяндзоў, ня толькі з Полацку, але і з навакольных гарадоў і мястэчак. Яны акуратна занялі апошні шэраг залі і ўважліва слухалі выступоўцаў. Адзін толькі айцец Вячаслаў Барок з Расонаў азадачыў спадароў рэдактараў пытаньнем: «Як вы думаеце, колькі засталося праіснаваць «НН»? Пры гэтым а.Вячаслаў пажадаў газэце доўгіх гадоў.

Напрыканцы аўтар найлепшага пытаньня атрымаў у падарунак факсымільнае выданьне «Нашай Нівы» за 1911 год. Не засталіся з пустымі рукамі і менскія госьці. Ірына Жарнасек падаравала ім падшыўку часопісу «Наша Вера» за апошнія гады.

Сустрэча скончылася выкананьнем двух гімнаў: «Не загаснуць зоркі ў небе» і «Магутны Божа». У адрозьненьне ад менскай публікі, палачане сьпявалі стоячы.

Сустрэча скончылася пасьля дзясятай вечара.

**Зьміцер Панкавец**

# Саюз беларускіх пісьменьнікаў зьявіўся ў Вільні

9 кастрычніка ў Вільні ў Доме пісьменьніка адбыўся ўстаноўчы сход новай творчай арганізацыі «Саюз беларускіх пісьменьнікаў», у якім узялі ўдзел беларускія пісьменьнікі, якія жывуць у Вільні, старшыня беларускага СБП Алесь Пашкевіч і прадстаўнікі кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў Літвы на чале са старшынём Ёнасам Ліняўскасам.

Адзін з ініцыятараў заснаваньня арганізацыі Сяргей Дубавец у сваёй прамове зазначыў, што сярод бліжэйшых плянаў новай арганізацыі — правядзеньне ў Вільні мерапрыемстваў у гонар 100-годзьдзя «Нашай Нівы», заснаваньне пэрыядычнага выданьня, спрыяньне разьвіцьцю кантактаў паміж беларускай і літоўскай літаратурамі.



**Заснавальнікі новага Саюзу і іхныя госьці: Сяргей Вітушка, Віталь Каракорскі з сынам, сядзіць Аляксей Анішчык, за ім — Тацяна Сапач, Сяргей Дубавец, стаіць Тацяна Поклад, за ёй Алег Аблажэй, Алесь Аркуш і Алесь Пашкевіч.**

Заснавальнікамі новай арганізацыі выступілі сябры віленскай філіі СБП, на сходзе сярод іншых прысутнічалі: вядомы моладзевы лідэр 80-х Сяргей Вітушка і старэйшы на сёньня беларускі пісьменьнік 95-гадовы Аляксей Анішчык. Сваю падтрымку прапанавала кіраўніцтва літоўскага пісьменьніцкага Саюзу: юрыдычныя кансультацыі, памяшканьне.

Сход абраў рэдакцыйную камісію, якая будзе распрацоўваць статут арганізацыі, у яе склад увайшлі: Сяргей Дубавец, Віталь Каракорскі і Алег Аблажэй. Старшынём арганізацыйнага камітэту стаў Сяргей Дубавец.

**Алесь Аркуш**

# Бэнэфіс паэзіі

«Наша Ніва» распачала сьвяткаваньне 100-годзьдзя ў Менску паэтычнай вечарынай.

Сьвяткаваньне стогадовага юбілею «Наша Ніва» распачала ў верасьні ў Бэрліне. Цяпер чарга за Менскам. У сталіцы да сьвяткаваньня была прымеркаваная прэзэнтацыя кнігі Аляксандра Фядуты «Паэтычны аглядальнік». Зборнік склалі паэтычныя рэцэнзіі вядомага публіцыста, якія друкаваліся ў «НН» цягам 2005—2006 г. Цяпер А.Фядута выдаў з тых рэцэнзій цэлую кнігу.

Спачатку плянавалася, што імпрэза пройдзе ў Вялікай залі Дому літаратара, але ў апошні момант у арэндзе памяшканьня было адмоўлена. У тэрміновым парадку месца для прэзэнтацыі згадзіўся даць Палац мастацтваў. На жаль, ня ўсе ахвочыя трапіць на імпрэзу ведалі пра гэтую акалічнасьць: многія ішлі да будынку на Фрунзэ, 5.

Вечарыну распачаў бард Зьміцер Бартосік, які выканаў свой стары гіт «Нашаніўская пара». Потым слова ўзяў галоўны рэдактар «НН» Андрэй Дынько, ён адзначыў, што стогадовы юбілей супаў у часе зь 15-годзьдзем незалежнасьці. Сп.Дынько выступіў зь невялічкай прамовай, дзе збольшага паўтарыў галоўныя тэзы свайго артыкулу «Патрабую немагчымага — будзьце рэалістамі». А пасьля ў залі запанавала паэзія...

Аляксандар Фядута караценька распавёў, як нарадзілася гэтая кніга. Жартаваў: каб гэтак жа жорстка ён пісаў пра беларускіх палітыкаў, тыя б ужо даўно нанялі кілера, а паэты гэтага не зрабілі.




**Зьміцер Бартосік (зьлева) і Аляксандар Фядута.**

З паэтаў першым выступіў 20-гадовы Глеб Лабадзенка. Ён найперш адзначыў, чаму паэты яшчэ не нанялі кілера, — проста яны не такія багатыя, як палітыкі. Пасьля публіку адзін за адным захаплялі паэтычныя галасы.

Вершы чыталі Галіна Дубянецкая, Віктар Шніп, Міхась Скобла. Лера Сом ня толькі чытала, але і сьпявала пад гітару. Заля актыўна пляскала Юрасю Пацюпу, які прачытаў некалькі «вершаў-красвордаў». Экспрэсіўная Джэці выкананьнем сваіх твораў «парвала» залю і заслужыла самыя працяглыя воплескі.

Фядута прызнаўся, што мае ў сучаснай беларускай літаратуры два найулюбёнейшыя вершы: «Салавей» Генадзя Бураўкіна і «Бэз» Ірыны Багдановіч. Апошні верш Фядута змог пачуць у аўтарскім выкананьні, за што быў удзячны аўтарцы. Варта адзначыць, што пасьля кожнага выступу ён падыходзіў да выступоўцаў па аўтограф. Тое самае ён прапанаваў зрабіць гледачам.

Імпрэза скончылася харавым выкананьнем вершу Янкі Купалы «Нашай Ніве», больш вядомага як «Не загаснуць зоркі ў небе». Перад гэтым кожнаму ў залі раздалі аркушыкі з тэкстам і нотамі.

**Зьміцер Панкавец**



# Вялікі пост

210 пратэстантаў галадаюць, баронячы ад канфіскацыі будынак сталічнай пратэстанцкай поўнаэвангельскай царквы «Новае жыцьцё». Іх падтрымалі адзінаверцы зь іншых гарадоў і вернікі некаторых іншых хрысьціянскіх канфэсій.

Былы кароўнік на вуліцы Кавалёва, 72, што пад Кунцаўшчынай, агульнай плошчай 1641 м$^3$, царква «Новае жыцьцё» набыла яшчэ ў 2002 г. У будынку зрабілі эўрарамонт, паставілі крэслы і сталі выкарыстоўваць як храм.

У 2004 г. Менгарвыканкам пачаў забараняць праводзіць набажэнствы на Кавалёва, 72, матывуючы гэта тым, што будынак не прыстасаваны для гэтых мэтаў. 17 жніўня 2005 г. Менгарвыканкам прыняў рашэньне №1391 аб пазбаўленьні царквы права карыстаньня зямельным надзелам з наступным прымусовым выкупам будынку царквы. 29 верасьня 2006 г. фондам Менгармаёмасьці былі пералічаныя грашовыя сродкі на суму 37,5 млн руб. на рахунак царквы. Пасьля гэтага царква атрымала 10 дзён на вызваленьне будынку.

Тады 6 кастрычніка на зладжанай у царкве «Новае жыцьцё» прэс-канфэрэнцыі вернікі абвесьцілі пра пачатак бестэрміновай галадоўкі. Яны патрабуюць вяртаньня права ўласнасьці на зямельны надзел і будынак царквы, а таксама наданьня яму статусу культавай пабудовы. Пост-галадоўка, да якой далучыліся хрысьціяне іншых канфэсіяў, пачалася 5 кастрычніка ў чацьвер.

Акрамя таго, 3 кастрычніка ў Менгарвыканкам пададзеная заява на правядзеньне мітынгу 21 кастрычніка на плошчы Бангалор.

Паступова галадоўка набыла маштаб найбольшай у гісторыі Беларусі. На вечар серады да галадоўкі далучылася, паводле зьвестак «Новага жыцьця», 210 чалавек. Зь іх увесь час у царкве знаходзяцца 36 чалавек, 134 чалавекі прыходзяць сюды пасьля працы, 40 чалавек галадае ў іншых гарадох Беларусі. Акрамя таго, каля сотні менскіх пратэстантаў падтрымліваюць акцыю пратэсту кароткатэрміновымі (1—2 дні) пастамі-галадоўкамі. Штоноч у царкве дзяжураць каля сотні вернікаў, удзень акрамя 34 сталых галадоўшчыкаў застаецца яшчэ колькі дзясяткаў чалавек. Штовечар ладзяцца масавыя богаслужэньні, што зьбіраюць больш за паўтысячы вернікаў. Акцыю падтрымалі пастары вялікай часткі эвангелічных суполак. З гарадоў Беларусі да галадоўкі далучыліся вернікі ў Барысаве, Берасьці, Віцебску, Воршы, Гомелі, Горадні, Дзяржынску, Мазыры, Лідзе, Талачыне, Стоўпцах, Магілёве.

У царкве галадоўшчыкаў штовечар наведваюць мэдыкі. Паводле стану здароўя пакінулі галадаць пэнсіянэрка і школьніца.

Галадоўшчыкі маюць падтрымку і за межамі Беларусі. Пратэстанты суседніх зь Беларусяй краінаў абяцаюць зладзіць акцыі пратэсту ля беларускіх амбасадаў. У сераду 11 кастрычніка пратэстантаў наведалі прадстаўнікі амэрыканскай амбасады, якія паабяцалі на працягу акцыі пратэсту інфармаваць Дзярждэпартамэнт ЗША аб сытуацыі вакол царквы «Новае жыцьцё».

Пастар царквы Вячаслаў Ганчарэнка рашуча настроены бараніць царкву да апошняга: «Будынак мы не аддамо». Кіраўніцтва царквы лічыць, што наступным крокам можа стаць ліквідацыя суполкі. Царква «Новае жыцьцё» налічвае каля 1500 вернікаў. Акрамя яе ў Мін'юсьце зарэгістраваныя царква хрысьціянаў веры эвангельскай «Благодать», што налічвае каля 3000 вернікаў, баптысцкая царква «Галгофа» (2000 чалавек), бабруйская пратэстанцкая суполка з 1000 чалавек і яшчэ каля тысячы пратэстанцкіх суполак, што налічваюць меншую колькасьць вернікаў.

Сустаршыня аргкамітэту Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Аляксей Шэін таксама далучыўся да галадоўкі. На думку сп.Шэіна, сытуацыя з будынкам царквы мае некалькі варыянтаў разьвязаньня. Першае — сілавое вырашэньне з прыцягненьнем да высяленьня міліцыі. Другое, што падаецца больш вераемным, — зацягваньне вырашэньня праблемы. «На носе зіма, і, магчыма, улады спадзяюцца, што людзі стомяцца пратэставаць, увага да акцыі пратэсту ападзе», — мяркуе А.Шэін.

Трэба адзначыць, што ўлады праявілі актыўнасьць у дачыненьні да акцыі пратэсту толькі праз тыдзень ад яе пачатку. У сераду ранкам да будынку царквы «Новае жыцьцё» наблізілася калёна цяжкагрузных аўтамабіляў, адзін зь якіх прывёз на плятформе бульдозэр. Суправаджалі калёну тры мікрааўтобусы. Шлях на тэрыторыю царквы ім перагарадзілі вернікі, павыганяўшы на дарогу свае аўто. Кіроўца бульдозэра не патлумачыў мэты візыту, сказаўшы адно, што тэхніка знаходзіцца тут на загад Менгарвыканкаму. Вернікі царквы зьвярнуліся з пытаньнямі да начальніка аўтакалёны, на што пачулі невыразнае: «Я тут прыехаў свой участак трошкі параўняць». Пасьля гэтага бульдозэр зьехаў з плятформы і на працягу паўгадзіны «раўняў» пляцоўку непадалёку ад аўтамабільнага пікету. Астатнія аўто неўзабаве зьехалі, а бульдозэр зьнік у бліжэйшым завулку прыватнага сэктару.

Сёньня ж у царкву патэлефанавалі з ЖРЭУ Маскоўскага раёну. Праўніка царквы запрасілі падпісаць акт перадачы будынку царквы ў валоданьне ЖРЭУ Маскоўскага раёну. На пытаньне, чаму менавіта ў ЖРЭУ, а ня ў Фонд маёмасьці, праўнік «Новага жыцьця» пачуў, што Фонд перадаў будынак царквы на балянс Маскоўскага раёну.

У прэс-службе экзархату Беларускай Праваслаўнай Царквы, а таксама ў курыі Рыма-Каталіцкага Касьцёлу адмовіліся камэнтаваць акцыю пратэсту пратэстантаў. У экзархаце спасläліся на адсутансьць поўнай інфармацыі ды на тое, што гэтая гісторыя адбываецца ў рамках іншай хрысьціянскай канфэсіі. У Касьцёле адмову нічым не патлумачылі.

**Сямён Печанко**

# Красоўскага арыштавалі таму, што ён мусіў стаць наступнікам Дашкевіча?

Ад мінулага чацьвярга ў ізалятары часовага ўтрыманьня ў Віцебску паводле жудкага абвінавачаньня знаходзіцца 22–гадовы актывіст моладзевага руху з Жодзіна Павал Красоўскі.



Юлія Дарашкевіч

Яго затрымалі 4 кастрычніка супрацоўнікі абласнога аддзелу па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю. Правялі невялічкі допыт, а пасьля ператрус у Паўлавай кватэры, канфіскавалі друкаваныя матэрыялы, кампутарны сыстэмны блёк і дыскі. Красоўскаму паведамілі, што ён падобны да фатаробата галоўнага падазраванага ў справе леташніх віцебскіх выбухаў.

На міліцэйскай машыне Красоўскага завезьлі ў Віцебск, дзе ўручылі позву на заўтра. У той вечар карэспандэнт «НН» яшчэ здолеў пагутарыць з Паўлам, ягоны голас не гучаў прыгнечаным. Красоўскі казаў, што яму няма чаго баяцца, бо ён не разумее, у чым яго абвінавачваюць.

Назаўтра Красоўскі накіраваўся з адвакатам Паўлам Сапелкам на допыт, які доўжыўся звыш васьмі гадзінаў, пасьля чаго сьледчы зачытаў пастанову: Павал мусіць быць затрыманы як падазраваны паводле артыкулу «замах на забойства дзьвюх і болей асобаў, зьдзейсьнены агульнанебясьпечным чынам» (арт.14 п.1 і 5 ч.2 арт.139 Крымінальнага кодэксу).

Варта нагадаць, што гучныя віцебскія выбухі адбыліся летась 14 і 22 верасьня. Першы з выбухаў грымнуў ля аўтобуснага прыпынку на праспэкце Фрунзэ, былі траўмаваныя два чалавекі. Паводле вэрсіі сьледзтва, прыстасаваньнем для выбохоўкі сталася піўная бляшанка, начыненая цьвікамі і іншымі мэталічнымі прадметамі. Другі інцыдэнт здарыўся падчас дыскатэкі ля кавярні «Эрыдан» 22 верасьня і меў больш значныя наступствы, тады ад выбуху пацярпела больш за 40 чалавек. Праваахоўнікі заявілі, што прыстасаваньне было ідэнтычнае першаму.

Празь месяц пасьля віцебскіх падзеяў Аляксандар Лукашэнка на ўрачыстасьцях у Лоеве заявіў, што выканаўцы выбухаў знойдзеныя, яны ўжо прызналіся ў зьдзейсьненым і даюць паказаньні. Сапраўды, у той час былі арыштаваныя браты Віталь і Юры Мурашкі. Іхні бацька быў гадзіньнікавым майстрам, таму дома ў братоў было шмат мэханізмаў, адпаведных тым, якімі рабілі выбухі. Братоў пратрымалі за кратамі каля паўгоду і нечакана выпусьцілі з афіцыйнай фармулёўкай «за недастатковасьцю доказаў».

Прыкладна ў той самы час прадстаўнікі праваахоўных органаў правялі ператрусы на кватэрах віцебскіх і ня толькі актывістаў дэмакратычнага руху. З таго часу справа віцебскіх выбухаў не была заўважнай у дзяржаўных і недзяржаўных СМІ. Цяпер жа яна атрымала новы віток.

Генэрал міліцыі ў адстаўцы Мечыслаў Грыб мяркуе, што выбухі былі звычайным хуліганствам, свавольствам нейкіх падлеткаў. «Там не магло быць ніякай палітыкі, бо выбухі не былі прымеркаваныя да нейкай значнай падзеі. Чаму міліцыянты не знайшлі вінаватых? Мне падаецца, што гэта мог учыніць адзін чалавек, які болей не прызнаўся абсалютна нікому ў сваім учынку. Пасьля затрымалі гэтых небаракаў-братоў. Сапраўды вінаваты ў тых выбухах даўно стаіўся. Цяпер вось такім чынам спрабуюць запалохаць моладзь у краіне. Гэта помста ўладаў моладзі за Плошчу», — мяркуе экс-сьпікер Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб.

Праваабаронца, былы сьледчы Алег Воўчак думае, што тыя выбухі ня мог бы арганізаваць дылетант без папярэдняй падрыхтоўкі. «Мне падаецца, што там усё было зроблена на прафэсійным узроўні, — кажа сп.Воўчак. — Моладзь, натуральна, тут абсалютна ні пры чым. Гэтыя падзеі маглі быць на руку пэўнай групе людзей. Каму менавіта, пакуль не выпадае гаварыць. А абвінавачаньні Красоўскаму абсурдныя».

У сераду зьявіліся зьвесткі, што акрамя выбухаў, актывісту інкрымінуюць таксама два крымінальныя эпізоды за 1999 год згодна з арт.139 ч.2 пункты 7, 8, 16 («забойства, спалучанае са згвалтаваньнем ці гвалтоўнымі дзеяньнямі сэксуальнага характару»). Нагадем, што ў 1999-м Паўлу было 16 гадоў.

Па ўсіх гэтых абвінавачаньнях Паўлу пагражае пажыцьцёвае зьняволеньне альбо сьмяротнае пакараньне. Варта адзначыць, што, са словаў адваката, у дні выбухаў Красоўскі ня быў у Беларусі, і штампы ў пашпарце гэта пацьвярджаюць.

У кастрычніку ў Кіеве мусіў адбыцца зьезд незарэгістраванага «Маладога фронту», дзе Красоўскі мог заняць месца Зьмітра Дашкевіча, які цяпер знаходзіцца ў турме. Улады амаль цалкам разграмілі актыў «МФ». На «хіміі» адбываюць пакараньні Павал Севярынец і Артур Фінькевіч, у ізалятары Зьміцер Дашкевіч, пад крымінальнай справай у крадзяжы знаходзіцца салігорац Іван Шыла. Чарговае зьвяно ў гэтай справе — Красоўскі.

Павал Красоўскі — адзін з харызматычных лідэраў моладзі, вядомы далёка за межамі Жодзіна. Ён займеў вядомасьць пасьля галадоўкі летась супраць выдаленьня маладзёнаў з навучальных установаў за палітыку. У Паўла хутка мусіць зьявіцца дзіця.

Нагадаем, што сёлета на Красоўскага ўжо была заведзена крымінальная справа за абразу гонару чыноўніка з Жодзінскага гарвыканкаму, але пасьля яе прыпынілі.

**ЗП**

## «Дашкевіч і Красоўскі вытрымаюць»

### Вядомыя ў Беларусі людзі — пра арышт Паўла

**Лявон Баршчэўскі:** «Патыхае чыста палітычным перасьледам. Улады мэтанакіравана спрабуюць задушыць «Малады фронт». Калі б арышт Красоўскага не супадаў з затрыманьнем Дашкевіча, допытамі Севярынца, яшчэ можна было б што-небудзь падумаць, а так усё зразумела. Справа мае відавочныя палітычныя карані».

**Уладзімер Арлоў:** «Гэтымі днямі ўсё часьцей згадваецца нядаўні допіс Паўла Севярынца «Калёнія звычайнага рэжыму». Аўтар піша, што ў нашай краіне кожнаму, хто ня згодны з уладаю, пагражае «ўзмацненьне рэжыму». (На маю думку, Павал ператвараецца ў найвыбітнага беларускага публіцыста.) Пасьля сакавіцкіх падзеяў набірае абароты кампанія агульнага запалохваньня. Калі ты ня любіш уладу, а любіш Радзіму і працуеш дзеля яе эўрапейскай будучыні, цябе могуць абвінаваціць у любы момант нават у забойстве і гвалтаваньні. Але гэта ня сьведчаньне сілы ўлады, а яе няпэўнасьці і знэрвованасьці. Няўжо гэтага не разумеюць сьледчыя і судзьдзі? Няўжо настолькі ўпэўненыя, што не давядзецца адказваць?..»

**Аляксандар Мілінкевіч:** «Крымінальныя справы Дашкевіча і Красоўскага — зьвёны аднаго ланцуга. Улады спрабуюць гэткім чынам павесіць на маладзёнаў ярлыкі экстрэмістаў, тэрарыстаў, зладзеяў. З дапамогай брутальных мэтадаў, жорсткага прэсінгу яны спрабуюць запалохаць нашу моладзь, якая ўпарта не зграджаецца ісьці на кампраміс з уласным сумленьнем. Моладзь мае сваю ўласную пазыцыя, яна не баіцца яе выказваць услых, за што ўлады і помсьцяць ёй. Я перакананы, што ўлады ня змогуць зламіць гэтых хлопцаў. Я перакананы, што яны вытрымаюць».

**Апытаў ЗП**

КАМЭНТАР

# Неймаверныя абвінавачаньні супраць Красоўскага

### Выглядае, што новымі абвінавачаньнямі Паўла спрабуюць вымусіць «прызнацца» ў тэрарызьме.

Незарэгістраванаму праваабарончаму цэнтру «Вясна» стала вядома, што акрамя выбухаў у Віцебску 14 і 22 верасьня 2005 году жодзінскаму актывісту Паўлу Красоўскаму інкрымінуюць яшчэ два крымінальныя эпізоды за 1999 год згодна з артыкулам 139 ч.2 пункты 7, 8, 16 («забойства, спалучанае са згвалтаваньнем ці гвалтоўнымі дзеяньнямі сэксуальнага характару; з мэтай схаваць іншае злачынства ці аблегчыць яго зьдзяйсьненьне ...»). Санкцыяй у гэтым артыкуле прадугледжваецца пажыцьцёвае зьняволеньне ці сьмяротнае пакараньне. Допыт Красоўскага працягваецца.

Усё выглядае так, нібы новымі абвінавачаньнямі Паўла спрабуюць зламіць і вымусіць «прызнацца» ў тэрарызьме.

Арышт Паўла Красоўскага выглядае прадвесьнікам новых мэтадаў перасьледу актывістаў беларускай апазыцыі. Калі раней асуджалі да зьняволеньня паводле «палітычных» артыкулаў, такіх як маляваньне графіці на сьценках ці арганізацыя масавых беспарадкаў, то Красоўскага зьвінавацілі па звычайнай «крымінальцы». Абвінавачаньні супраць Красоўскага (тэрарызм у 2005 годзе, у часе, калі Красоўскі быў за межамі краіны, і забойствы, нібыта зьдзейсьненыя ў 1999 годзе, калі Красоўскаму было 16 гадоў) выклікаюць жах. Кожны можа паставіць сябе на месца Паўла, ягонай маці або нявесты.

Між тым у Салігорску ўжо распачатая крымінальная справа супраць моладзевага актывіста Івана Шылы па падозраньні... у крадзяжы.

Пры гэтым на памяць прыходзяць найгоршыя мэтады правакацый і дыскрэдытацыі, якія ўжывалі спэцслужбы дыктатарскіх рэжымаў мінулых часоў, каб запалохаць пратэставыя слаі насельніцтва і перадусім моладзь.

Абвінавачваньні супраць маладафронтаўцаў Севярынца, Фінькевіча, Дашкевіча і асабліва Красоўскага вымагаюць неадкладнай і салідарнай рэакцыі беларускага незалежнага грамадзтва і сусьветнай супольнасьці. Гэта якраз той выпадак, калі правяраецца сьпеласьць нацыі.

**Зьміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Сяргей Лаўроў: Сытуацыя польскай меншасьці ў Беларусі — як расейскай у Латвіі

Міністар замежных справаў Расеі Сяргей Лаўроў **(на фота)**, знаходзячыся зь візытам у Польшчы, нечакана ўзьняў справу польскай меншасьці ў Беларусі. На ягоную думку, сытуацыя палякаў у Беларусі нагадвае становішча расейскай меншасьці ў Латвіі, якая, на думку Масквы, церпіць уціск. Ніколі раней расейскія дыпляматы так не выказваліся.

Уплывовая варшаўская «Газэта Выборча» інтэрпрэтуе гэтую заяву як праяву далейшага пагаршэньня дачыненьняў Беларусі й Расеі.

**БТ**

# Міліцыянты прыйдуць да кожнага беспрацоўнага

Пасьля ўліку працоўных рэсурсаў зь непрацуючымі пачнуць разьбірацца.

МУС Беларусі мае намер «правесьці перапіс няўлічаных працоўных рэсурсаў». Паводле слоў першага намесьніка начальніка Дэпартамэнту па грамадзянству і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксея Бегуна, прыкладна кожны трэці працаздольны беларус не заяўляе аб сваіх крыніцах даходаў, ня плаціць падаткаў і ня робіць адлічэньняў у сацыяльныя фонды. Фактычна, міліцыянтам давядзецца дайсьці да кожнага беспрацоўнага чалавека, каб высьветліць, на каго гэтыя людзі працуюць, піша газэта «Звязда».



**Аляксей Бягун абяцае перапісаць непрацуючых.**

Агульная колькасьць такіх, ня ўцягнутых у актыўную працоўную дзейнасьць асоб, складае амаль 1 мільён чалавек. Сьпіс «нахлебнікаў» на шыі ў грамадзтва даволі вялікі. У гэтую катэгорыю, напрыклад, уваходзяць і людзі, якія займаюцца хатняй гаспадаркай, і кантынгент месцаў пазбаўленьня волі, і нелегальныя прадпрымальнікі, і гастарбайтэры. Таму, як паведаміў Аляксей Бягун, МУС краіны вырашыла правесьці татальны маніторынг усіх суайчыньнікаў, якія працуюць за мяжой, і грамадзян, якія тайна зарабляюць сабе на хлеб у Беларусі.

Фактычна, міліцыянтам давядзецца дайсьці да кожнага чалавека з названага вышэй «мільённага сьпісу», каб высьветліць, на каго гэтыя людзі працуюць. На гэта спатрэбіцца ня менш за 2—3 месяцы. Пасьля таго, як будзе завершаны своеасаблівы перапіс няўлічаных працоўных рэсурсаў, Міністэрства ўнутраных спраў выступіць з канкрэтнымі прапановамі дзеля іх легалізацыі. Суграмадзянаў, якія не захочуць дзяліцца даходамі зь дзяржавай, прапануецца пазбавіць пэўных сацыяльных гарантый. Якія канкрэтна меры будуць прынятыя, Аляксей Бягун не паведаміў, бо «пытаньне толькі вывучаецца», — адзначае «Звязда».



WWW.SVABODA.ORG

**На фота: Тбілісі. Грузінская паліцыя эскартуе расейскіх афіцэраў, абвінавачаных у шпіянажы, на тэрыторыю офісу АБСЭ.**

## Выбары прызначылі на 14 студзеня



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

А.Лукашэнка сваім указам вызначыў, што выбары дэпутатаў мясцовых саветаў адбудуцца 14 студзеня.

# «Усе асобнікі кнігі Сіпакова мусяць быць зьнішчаныя»

Кіраўнік выдавецтва «Харвест» **Юры Хацкевіч**: інцыдэнт адбыўся праз няведаньне таго, што знак «Беларускага кнігазбору» афіцыйна зарэгістраваны.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У верасьні на паліцах беларускіх кнігарняў зьявілася кніга эсэ пісьменьніка Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на плянэце Зямля». У самім факце выданьня такой кнігі няма нічога дзіўнага, апроч таго, што выданьне пабачыла сьвет пад вокладкай «залатой» сэрыі «Беларускага кнігазбору». Як высьветлілася пазьней, сам «Беларускі кнігазбор» ня меў ніякага дачыненьня да выданьня кнігі. Зборнік убачыў сьвет ў недзяржаўным выдавецтве «Харвест».

Па нейкім часе ўправа МГА «Белкнігазбор» выступіла з заявай да сваіх чытачоў, дзе гаварылася, што кніга Янкі Сіпакова выйшла «бязь ведама і дазволу і не адпавядае канцэпцыі і прынцыпам сэрыі». Такім чынам, «Харвест» парушыў аўтарскія правы, выкарыстаўшы афіцыйна зарэгістраваны таварны знак.

Кіраўнік выдавецтва «Харвест» Юры Хацкевіч кажа, што інцыдэнт адбыўся праз няведаньне таго, што гэты знак «Беларускага кнігазбору» ёсьць афіцыйна зарэгістраваным. «Мы ня ведалі гэтага. Сіпакоў прынёс да нас кніжку і вельмі рашуча настойваў, каб яна выйшла менавіта ў гэтай сэрыі і менавіта пад такой вокладкай, нам не ўдалося яму ў гэтым адмовіць. 13 кастрычніка ў мяне мусіць адбыцца сустрэча з кіраўніком Міжнароднага грамадзкага аб'яднаньня «Белкнігазбор» Кастусём Цьвіркам. Папярэдне мы ўжо дамовіліся зь ім, што ў нашым выдавецтве пад такім знакам можа выйсьці яшчэ парачка кніжак «кнігазбораўскай» сэрыі», — сказаў Юры Хацкевіч.

Сам Янка Сіпакоў ня меў вялікага жаданьня размаўляць з карэспандэнтам «НН», сказаўшы, што нічога ня ведае ў гэтай справе. Сіпакоў адзначыў, што ў вочы пакуль ня бачыў гэтай кнігі і не трымаў яе ў руках. Разам з тым Янка Сіпакоў пацьвердзіў, што бліжэйшым часам у «Харвесьце» сапраўды павінна была зьявіцца ягоная кніга.

Сп.Сіпакоў толькі аднойчы ажывіўся, калі гаворка пайшла пра зварот управы МГА «Белкнігазбор» да чытачоў, ён зь неўдаваным інтарэсам папрасіў яго зачытаць, калі ж выявілася, што там нічога цікавага для яго няма, ён сьпехам разьвітаўся, яшчэ раз пацьвердзіўшы, што ня мае да справы ніякага дачыненьня, і паклаў слухаўку.

Як пацьвердзілі нам у «Беларускім кнігазборы», яны таксама тэлефанавалі да Янкі Сіпакова, пісьменьнік папрасіў ня ўцягваць яго ў гэтыя разьбіральніцтвы, бо мае кепскае здароўе пасьля нядаўняга інфаркту — праблемы з сэрцам. Між тым, паводле словаў «кнігазбораўцаў», Сіпакоў нават… падпісаў сваю кніжку Кастусю Цьвірку. Управа МГА «Белкнігазбор» зьвярнулася да ТАА «Харвест» з прапановай дасудовага ўрэгуляваньня спрэчкі, а менавіта: адклікаць з кнігарняў і бібліятэк увесь наклад кніжкі Сіпакова, замяніць яе вокладку і тытульныя лісты або зьнішчыць увесь наклад, прынесьці афіцыйныя прабачэньні «Беларускаму кнігазбору» і чытачам.

У «Кнігазборы» кажуць, што Янка Сіпакоў прыходзіў да іх з кнігай з просьбай падлічыць, колькі будзе каштаваць выданьне кніжкі яго эсэ. Атрымаўшы каштарыс, аўтар у «Кнігазбор» болей не зьвяртаўся. «Кніга, што выйшла ў выдавецтве «Харвест», не пасуе да канцэпцыі нашай кніжнай сэрыі, — кажуць у «Белкнігазборы». — Мы друкуем толькі клясыкаў беларускай літаратуры і літаратурныя помнікі. У кнізе мусіць быць пададзенае найлепшае з усіх жанраў, у якіх працаваў клясык, выданьне павінна суправаджацца грунтоўным уступным артыкулам і падрабязным камэнтаром. Таму кніга Сіпакова абсалютна не пасуе да канцэпцыі пекнай кніжнай сэрыі».

«Кнігазбораўцы» зьбіраюцца даводзіць справу да суду толькі ў тым разе, калі не патрапяць даць рады любамірна.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Дашкевіч сядзіць у камэры з хворымі на сухоты, гепатыт і СНІД

Зь лістоў на волю.

«У прынцыпе, тут можна нармальна пачытаць хоць кнігі, бо носісься на волі, носісься — а вынік? Во, краты, параша, тубэркулёзьнікі, гепатытнікі, і нават з адным сьпідозьнікам сядзеў. Прычым нармальны хлопец. Мусарам сам сказаў, што ВІЧ-інфікаваны, а яго — у агульную хату. Хоць тут найстрашнейшыя тубэркулёз і гепатыт, якія амаль усе маюць.

А так усё добра. Бывае, надыходзіць пэсымізм, бо нешта з фронту там ня вельмі навіны. Калі можаш там, паўплывай на каго, каб жылі ў міры і любові.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Аддалі мне Бібліі, спаслаўшыся на тое, што яны не маглі разабраць почырк (твой:). А разам зь Бібліямі — мой зварот да кіраўніка СІЗА з папярэджаньнем аб галадоўцы. Карацей, давядзецца есьці.

Хацеў таксама папрасіць не перадаваць у пятніцу й суботу перадачак, бо пост у мяне, а кабан тут уходзіць за суткі :). Ну, такія правілы гульні».

**ЮлД**

**Сьведчаньні з блогу дзяўчыны, што носіць перадачы З.Дашкевічу, — старонка 21.**

# Менск: выбух у школе

Вучань 10-й клясы менскай школы №69 адчыніў у калідоры школы стары газавы балёнчык. Той выбухнуў. Няўдалы жартаўнік трапіў у рэанімацыю разам з чатырма школьнікамі, якія былі ў момант выбуху вакол яго.

Яшчэ 20 вучняў шпіталізавалі з атручаньнямі рознай ступені.

Супраць урвіса ўзбудзілі крымінальную справу.

**МБ**



WWW.SVABODA.ORG

**Міліцыянты ў цывільным пільнуюць паштовую скрыню.**

# Флэш-моб сарваўся, але лісты пайшлі

У суботу а 18-й ля менскага Галоўпаштамту мусіў адбыцца флэш-моб у падтрымку палітвязьняў Красоўскага і Дашкевіча. Моладзь прыйшла з напісанымі да іх лістамі падтрымкі, каб, стаўшы ў чаргу, апусьціць іх у скрыню.

Аднак чаргі не атрымалася: паштамт і нават прылеглыя вуліцы акупавалі міліцыянты ў цывільным. Моладзі нічога не заставалася, як падысьці па адным, укінуць лісты ў скрынку і разысьціся.

**СМ**

# У Астрэйкі нарадзілася дачка


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У сераду а 9:45 у палітвязьня Міколы Астрэйкі нарадзілася дачка. Пра гэта карэспандэнту «НН» паведаміла Вера Шалайка, якая сёньня ўжо бачылася зь Міколавай жонкай Палінай **(на фота)**. Дзяўчынка мае 3280 грамаў вагі.

Мікола цяпер перабывае ў шклоўскай калёніі. Яго асудзілі да двух гадоў зьняволеньня паводле справы «Партнэрства».

Рэдакцыя «НН» далучаецца да віншаваньняў і зычыць Міколу найхутчэй убачыць сваю крывінку.

**ЗП**

# Мілінкевіч будзе езьдзіць, езьдзіць, езьдзіць


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Стаўшы даверанай асобай кандыдатаў.

**«Я буду даверанай асобай у вялікай колькасьці кандыдатаў і праеду максымальную колькасьць гарадоў краіны», — заявіў лідэр аб'яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч падчас он-лайнавай канфэрэнцыі на радыё «Свабода».**

**— Мы знойдзем магчымасьці, каб падчас выбараў разам з кандыдатамі ў мясцовыя саветы праводзіць разнастайныя сустрэчы. Формы сустрэчы вызначым мы, — паабяцаў палітык. — Нас сапраўды пазбавілі права выбіраць. Сёньня ў нашай краіне ўлада нелегітымная, і зьмяніць яе выбарамі немагчыма. Яшчэ раз кажу, што ў стратэгіі дэмакратычных сілаў галоўная мэта — гэта вуліца. Мірная вуліца, без радыкальных дзеяньняў.**

**by.milinkevich.org**

## Мілінкевіч выказаў спачуваньне з нагоды сьмерці Паліткоўскай


WWW.NTV.RU

**Ганна Паліткоўская.**

А.Мілінкевіч накіраваў рэдакцыі расейскай «Новой газеты» (НГ) спачуваньне ў сувязі з трагічнай сьмерцю вядомай журналісткі Ганны Паліткоўскай. У пасланьні, у прыватнасьці, гаворыцца:

«Калі забіваюць журналіста, няма розьніцы, адбылося гэта ў тваёй краіне ці не. Дэмакратычная Беларусь ведае, як гэта балюча, губляць журналістаў... Для свабоды няма спакойных часоў».

Г.Паліткоўская была забітая 7 кастрычніка ў Маскве ў пад'ездзе ўласнага дому. На месцы забойства знойдзеныя 4 гільзы і пісталет. Рэдакцыя «НГ» мяркуе, што забойства мог замовіць або кіраўнік марыянэткавага ўраду Чачэніі Рамзан Кадыраў, або той, каму было б выгадна, каб падазрэньне ўпала на Кадырава.

**МБ**

# Пасьля страйку сьціхла «Новае радыё»

9 кастрычніка на хвалях 98,4 FM сьціхлі перадачы радыёстанцыі «Новае радыё», якое належыць Фэдэрацыі прафсаюзаў. У пятніцу нехта з супрацоўнікаў радыё ў жывым этэры зьвярнуўся да А.Лукашэнкі з просьбай абараніць іхні калектыў ад сваволстваў прафсаюзнага кіраўніцтва. Калектыў радыё абвесьціў страйк у сувязі з магчымым звальненьнем генэральнага дырэктара Віктара Грышанава.

У панядзелак супрацоўнікі «Новага радыё» склалі адкрыты калектыўны ліст. Пад ім падпісаліся 19 чалавек. Зь ліста можна зразумець, што на радыёстанцыі панавалі звадкі і інтрыгі. У гэтым вінавацяць прэс-сакратарку ФПБ Ірыну Каганец і ейных паплечніц.

У той самы дзень стала вядома, што ўсе падпісанты звольненыя з працы. На радыё засталіся толькі тры чалавекі, якія зусім нядаўна ўладкаваліся. Таму праца «Новага радыё» прыпыненая на месяц, пакуль не атрымаецца знайсьці новы склад рэдакцыі. Не працуе і сайт радыёстанцыі.

А тое радыё мала чым розьнілася ад іншых ФМ-папсовых галасоў.

**Зьміцер Панкавец**

# У Маскве затрымалі верхавода найбуйнейшай беларускай банды



Супрацоўнікі дэпартамэнту ў барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю ды тэрарызмам МУС Расеі затрымалі трох удзельнікаў найбуйнейшага беларускага злачыннага фармаваньня «Пажарнікі», у тым ліку іхняга лідэра — 35-гадовага Генадзя Бярэзіна.

Затрыманьне рабілі з дапамогай беларускіх калегаў у кватэры на Кутузаўскім праспэкце. Акрамя Бярэзіна, схапілі Алега Чыркова і Вячаслава Ліцэнштэйна. У іх сканфіскавалі фальшывыя пашпарты грамадзянаў Расеі і Беларусі.

Паводле інфармацыі МУС, усе затрыманыя былі ў міждзяржаўным вышуку за ўчыненьне цяжкіх злачынстваў. Цяпер правяраюць, ці яны мелі дачыненьне да злачынстваў на тэрыторыі Расеі, і вырашаюць пытаньне пра іхнюю экстрадыцыю ў Беларусь.

Арганізаванае злачыннае фармаваньне (АЗФ) «Пажарнікі» паўстала на тэрыторыі Гомельскай вобласьці ў 1990-я. Бандыты спэцыялізаваліся на вымаганьнях, крадзяжох, «дахаваньні» прастытуцыі ды незаконным аўтабізнэсе.

У красавіку—чэрвені на тэрыторыі Маскоўскага рэгіёну затрымалі шасьцёх удзельнікаў АЗФ, што былі ў вышуку. У жніўні 2006 г. суд на Гомельскую вобласьць прызнаў 27 чальцоў банды вінаватымі ў больш як 100 злачынствах (у тым ліку блізка 80 цяжкіх і асабліва цяжкіх) і прысудзіў да астрогу ад 3 да 14 год. 11 бандзюкоў здолелі схавацца. Большасьць зь іх перабралася ў Расею.

**Газета.ру**

# Культура без чыноўнікаў: фэстываль good.by у Нямеччыне

Каб пазнаёміцца з той беларускай культурай, якой не кранула рука ўсёведнага чыноўніка, трэба выехаць за межы Беларусі.

Напрыклад, у Бэрлін, дзе прарокі, якім няма месца ў сваёй айчыне, з задавальненьнем знаёмяць іншаземную публіку з сваёй творчасьцю. У сталіцы Нямеччыны нядаўна адзначала стагодзьдзе беларуская газэта «Наша Ніва», а беларускія кінэматаграфісты правялі кінафэстываль у межах праекту «Партызанфільм». А да 18 кастрычніка ў Бэрліне будзе праходзіць фэстываль беларускай культуры пад назвай «Гуд-бай», адкрыцьцё якога прайшло ў мінулыя выходныя.

Вядомы беларускі гурт «Драм Экстазі» адкрываў фэстываль «Гуд-бай» сваім выступам у бэрлінскім клюбе «Каспар гаўзэр». Гурт выступаў разам з паэтам Ігарам Коршунам, які чытаў свае тэксты пад музыку беларускіх бубначоў…

**Радыё «Нямецкая хваля»**





ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Сафія можа трапіць у сьпіс культурнай спадчыны ЮНЭСКО

Сафійскі сабор у Полацку — адзін зь першачарговых кандыдатаў на ўключэньне ў Сьпіс сусьветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЭСКО. На ўключэньне ў сьпіс прэтэндуюць таксама Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку і культавыя збудаваньні абарончага тыпу ў Камаях на Пастаўшчыне.

У канцы 2006 — пачатку 2007 г. Беларусь і Польшча плянуюць накіраваць у Камітэт па ахове сусьветнай культурнай спадчыны ў Дурбане (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка) матэ

рыялы аб уключэньні ў Сьпіс ЮНЭСКО Аўгустоўскага каналу.

Пакуль у гэты сьпіс ад Беларусі ўключаны толькі 4 аб'екты: Белавеская пушча, Мірскі замак, комплекс рэзыдэнцыі Радзівілаў у Нясьвіжы і Дуга Струвэ.

**Народныя навіны Віцебску**

# Беларускіх заўзятараў вывезьлі ў румынскі лес

Адборачнік да Чэмпіянату Эўропы — 2008 паміж зборнымі Беларусі і Румыніі скончыўся прагназавана: 3:1 перамаглі нашчадкі князя Ўлада Цэпеша. Ужо на дзясятай хвіліне беларусы без варыянтаў «гарэлі».

Галоўны трэнэр зборнай Юры Пунтус назваў адной з прычынаў пройгрышаў беларускай зборнай — няведаньне яе гульцамі нацыянальнага гімну. Цяпер Пунтус возьме пад свой кантроль, каб кожны гулец зборнай ведаў гімн.


REUTERS

**Паліцыя выдаляе беларускіх заўзятараў з стадыёну.**

Матч Румынія—Беларусь таксама запомніцца калясрпартовымі падзеямі на стадыёне «Сьцяўа». Дзясяткі беларускіх заўзятараў напачатку гульні былі пасаджаныя ў аўтобусы і вывезеныя за межы Бухарэсту. Гэта адбылося пасьля таго, як у беларускім сэктары пачаліся бойкі. Цяжка даць адназначны адказ, хто быў іхнім ініцыятарам: гарачыя ад выпітых сьпіртных напояў беларусы ці румынскія фанаты. Беларуская амбасада ў Бухарэсьце запэўнівае, што вінаватыя гаспадары стадыёну. Тады становіцца дзіўным, зь якой прычыны беларусаў вывезьлі ў лес.

Ніхто з суайчыньнікаў ня быў затрыманы, кажуць у пасольстве. Цікава, ці зьбіраюцца беларусы скардзіцца ў суд з прычыны таго, што не змаглі паглядзець матч, за які заплацілі, і хто будзе ў ролі адказьніка.

Астатнія матчы нашай групы скончыліся наступным чынам: Славенія—Люксэмбург 2:0, Баўгарыя—Галяндыя 1:1.

**Зьміцер Панкавец**

# Выстава Шатэрнікаў у Нью-Ёрку

У Нью-Ёрку ў Музэі рускага сучаснага выяўленчага мастацтва Джэрзі-Сіці 8 кастрычніка адкрылася пэрсанальная выстава двух мастакоў зь Беларусі — Алеся Шатэрніка і ягонай дачкі Юлі. На выставе — больш за паўсотні палотнаў зь Беларусі й працы Юлі, выкананыя ў Нью-Джэрзі.

Алесь Шатэрнік, вядомы як скульптар, апошнія гады стала працуе ў галіне жывапісу. Паводле вызначэньня Аляксандра Глейзера, дырэктара музэю, жывапіс А.Шатэрніка належыць да «нэаімпрэсіянізму».

Музэй А.Глейзера, вядомага ў сьвеце мастацтвазнаўцы, знакаміты тым, што зьбірае і выстаўляе мастацтва нонканфармістаў. Сярод іх — удзельнікі «бульдозэрнай выставы» ў Маскве: Аскар Рабін, Алег Цалкоўва, Міхаіл Шамякін. Стала супрацоўнічае зь Нью-Ёрскім музэем і наш знакаміты суайчыньнік Барыс Забораў.

Выстава мае доўжыцца да 22 кастрычніка.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Габрэйскія танцы ля Камароўкі. Фэст восеньскіх сьвятаў зладзіла 8 кастрычніка габрэйская грамада Менску.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

# Кіслая глеба

**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

У самы разгар эпахальнай для кожнага беларуса пары капаньня бульбы ў сіценскіх ваколіцах бязьлюдна. Вяскоўцы ў лесе — хто ў лісічках, хто ў брусьніцах, хто ў журавінах. Калі запытваесься ў народу, якія выстройваецца ў чаргу ў краме па прывазную бульбу, чаму сіценцы не саджаюць самі, адмахваюцца: «Ай... Не расьце нічога. Глеба кіслая».

Глеба ў Сітне і праўда *кіслая* — пераўвільготненая. Ападкі перавышаюць сьцёк. Вакол балоты. Але, вось дзіва, ля хаты дзеда Роберта (таго самага, які больш за паўстагодзьдзя слухае «Свабоду») — і бульба, і гуркі, і перцы, і морква, ды дабрэнныя, ды яшчэ клубніцы, ды вінаград... «У вас што, — пытаюся, — мясцовая анамалія?»

«Так, анамалія, — сьмяецца дзед. — Во, прывязу вапны воз... кіслую ж глебу вапнаваць трэба, ну і гною, вядома, колькі тачак... Вось і родзіць. Калі вапны няма — можна попелу зь печы».

Пэўна ж, нездарма Госпад Бог даў Паазер'ю, апроч кіслых глебаў, яшчэ й найбуйнейшае ў Эўропе радовішча даляміту ў Рубе пад Віцебскам — далямітавая мука акурат і прызначаная дзеля таго самага вапнаваньня!

Але вяскоўцы штовосені, як манны нябеснай, чакаюць машыны, што завозіць у сельпо дзясяткі мяхоў гародніны. Купляюць малако — заводзкае, у пакетах — кефір, тварог. Па мяса едуць у Полацак на кірмаш...

На тэрыторыі сельсавету 10 гадоў таму было тры калгасы. Цяпер не засталося ніводнага. Ворыва засеялі... лесам. (Во зьдзівіліся б продкі-палачане часу Ўсяслава, што гэты лес немалою сілаю калісь карчавалі пад палі!..)

Гародзікі ў саміх вяскоўцаў зусім сьціплыя. Лапінка ля хаты, колькі яблыняў. Трактара ці камбайна на людзкіх «сотках» тут і ня ўбачыш — не разьвернуцца. Аруць канём ці матаблёкам. Зямля вакол вёскі ўвогуле пустуе.

Ну, добра, няхай і праўда, як той сьпяваў, не расьце какос... Але ж травы ў сіценскіх ваколіцах — мора. Жывёле — раскоша. Дзе ж жывёлагадоўля? У Сітне адна карова прыпадае на... 20 жыхароў. Сьмешна глядзець, як «статак» зь некалькіх мілкаў шпацыруе цэнтральнай вуліцай. «Каровы ідуць!» — тут ужо не падзея, а нейкая недарэчнасьць. Паводле дзіцячых

## ХРОНІКА

**2 кастрычніка**

Актывісту ПБНФ **Кастусю Баеву** з Рэчыцы не падоўжылі працоўнага кантракту на прадпрыемстве «Белтэхінвэнтарызацыя».

**3 кастрычніка**

Кіраўніцтва канцэрну «Белнафтахім» не дазволіла, каб адміністрацыя заводу «Полацак–Шкловалакно» дала офіс для **суполкі Свабоднага прафсаюзу Беларускага**.

Актывіста ПБНФ **Сержука Салаша** 3 кастрычніка «ўзмоцнена надгледзелі», калі ён вяртаўся з Украіны ў Беларусь.

**Аляксандру Бухвоставу**, у мінулым старшыню Партыі працы, зладзілі асабісты надгляд і прымусілі распрануцца, калі ён ехаў празь беларускую мяжу ў Літву.

У Бабруйску актывістка Беларускага незалежнага прафсаюзу **Алена Захожая** абвесьціла галадоўку: яна пратэстуе супраць таго, што адміністрацыя заводу праводзіць дыскрымінацыю паводле прафсаюзнай прыкметы, а органы юстыцыі й суд ня бачаць у гэтым парушэньня закону.

**4 кастрычніка**

У Наваполацку сябар КХП БНФ **Анатоль Кулік** пачаў галадоўку да 20 кастрычніка на знак салідарнасьці з палітвязьнем Аляксандрам Казуліным.

Моладзевага актывіста **Паўла Красоўскага** затрымалі ў Жодзіне, завезьлі ў Віцебск. 5 кастрычніка яго дапыталі ў справе леташніх віцебскіх выбухаў і затрымалі (пакуль што на 6 дзён).

У Гродне актывіста польскай мяншыні **Мечыслава Яскевіча** асудзілі на 4 сутак арышту: ён застаўся на волі, бо гэты тэрмін адседзеў ужо ў жніўні.

Вярхоўны суд прыпыніў разгляд пазову Мін'юсту наконт прыпыненьня дзейнасьці **ПКБ**.

**5 кастрычніка**

У Гомелі актывістаў АГП **Андрэя** і **Кацярыну Толчыну** выклікалі на адміністрацыйную камісію: іх абвінавацілі ў парушэньні пашпартнага рэжыму, што пагражае штрафам да 3 базавых велічыняў.

Адміністрацыйная камісія Жлобінскага райвыканкаму разглядала пратаколы трох старшаклясьнікаў — **Кірылы**, **Андрэя** ды **Аляксея**, абвінавачаных у несанкцыянанай акцыі 16 верасьня.

**6 кастрычніка**

У Магілёве супрацоўнікі КДБ спрабавалі завэрбаваць моладзевых актывістаў **Алеся Анісімава**, **Уладзімера Шчыціціна** ды **Яўгена Адзінца**. Усе ад прапановаў супрацы адмовіліся.

Крама «Асторыя» скасавала дамову на продаж недзяржаўнай газэты **«Мясцовы час»**, бо Пінскі гарвыканкам настойліва параіў кіраўніцтву мясцовых крамаў адмовіцца ад распаўсюду недзяржаўнай прэсы.

У судзе Маскоўскага раёну Берасьця прыпыненая справа на скаргу грамадзкага актывіста **Андрэя Шарэнды**, які абскарджваў вынесены яму ў ліпені штраф за распаўсюд інфармацыйных улётак пра мітынг. Актывіст папрасіў весьці працэс па-беларуску, але прадстаўніца гарвыканкаму заявіла, што па-беларуску не зразумее: цяпер ёй цэлы месяц будуць шукаць перакладчыка.

успамінаў, вырашыў быў, што ў бабулінай вёсачцы на Дняпры, пад Рэчыцай, справы лепшыя. Ані! Распытаўся — амаль тое самае. Старым трымаць карову ўжо й сілаў няма, а маладзейшыя п'юць, дык дзе яны тую худобу дагледзяць...

Тых, хто трымае сьвіньні, у Сітне можна пералічыць на пальцах. Відаць, парсюкі й тыя на кіслай глебе не растуць.

І гэта ня сіцэнскі «кулёр лякаль». Ва ўсёй Беларусі ўжо колькісот гадоў прагрэсуе паразытычная звычка. З кіслай мінай махаюць рукой на беларускую зямлю дзеячы, і робіцца зусім горка. Уздыхі й нараканьні на *глебу* чуюцца ў нас рэгулярна: гэтым звычайна апраўдваюць нежаданьне ды няўменьне працаваць — што на зямлі, што з грамадзтвам.

100 гадоў таму купка гэткіх жа, як і мы, беларусаў перасіліла ўнутраны стогн з прычыны несалодкае ды нятлустае глебы і пачала ўрабляць *Нашу Ніву*. Так, было цяжка, быў і пот, і сухоты, і кроў, і сьлёзы — але ж узаралі. І на гэтым не такім ужо вялікім кавалачку, бадай, вырасла ўсё беларускае нацыянальнае адраджэньне пачатку XX ст.: тут і БНР, і БССР, і беларусізацыя, і каранізацыя... Як у біблійнай прыпавесьці: «Узышло, і вырасла, і ўрадзіла: адно трыццаць, другое шэсьцьдзесят, трэцяе сто» (Марка 4:8).

На беларускай зямлі апошнія стагодзьдзі шмат хто спрабаваў жыць *на дурняк*. За кошт прыгоннага сялянства, калектывізацыі, мэліярацыі. Але Госпад, даручыўшы Адаму зямлю ў валоданьне, сказаў: «У поце твару твайго будзеш есьці хлеб, пакуль ня вернесься ў зямлю, зь якое ты ўзяты» (Быццё 3:19). Цяжка, укладваючы ўвесь час, усе высілкі, усю душу! — працаваць. Толькі тады тутэйшая глеба зьдзівіць сваёй плоднасьцю.

Няпростая беларуская зямля дадзеная беларусам дзеля выпрабаваньня іхняй хрэстаматыйнай цярплівасьці, руплівасьці, працавітасьці. Калі некаму хочацца есьці ананасы й жаваць рабчыкаў без асаблівых намаганьняў — ласкава просім на Канары. Патрыёт? Тады ўлягай, як за плугам, як у выбіраньне бульбы, як у штогадовае вапнаваньне, угнойваньне, баранаваньне кіслае глебы.

Ня будзем працаваць належным чынам ня зямлі — так і застанемся прыхаднямі-зьбіральнікамі.

За сто гадоў «Нашай Нівы», пэўна, гэта й ёсьць галоўным урокам для ўсіх беларусаў.

Толькі калі ўзаром, палепшым, акультурым грамадзкую глебу кожны на сваім кавалачку, перaтрэм уласнымі рукамі кожны камячок беларускіх праблемаў, цяжкасьцяў, сумненьняў — пасеяныя слова, вера й любоў дадуць нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

Патрыёт? Тады ўлягай, як за плугам.

## ХРОНІКА

Калектыў FM-станцыі **«Новае радыё»** абвесьціў страйк у жывым этэры. Падставай стала самаўпраўства заснавальніка — Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай: звальненьне гендырэктара радыёстанцыі.

**7 кастрычніка**

У Бабруйску падчас сьвяткаваньня «Дажынак» затрыманы маладзевы актывіст **Максім Буйніцкі**. За сям'ёй дэпутата гарсавету, актывіста ПБНФ **Алеся Чыгіра** цэлы дзень хадзілі супрацоўнікі ў цывільным.

**8 кастрычніка**

Над актывістам ПБНФ **Рыгорам Кастусёвым** праведзены асабісты надгляд на Берасьцейскай мытні пры вяртаньні на радзіму.

**10 кастрычніка**

Праваабаронцу **Алега Волчака** выклікалі ў Гарадзенскую рэгіянальную мытню да інспэктара па барацьбе з кантрабандай.

**АШ**

## У кнізе Паўла Севярынца крыміналу не знайшлі

Літаратуразнаўчая экспэртыза, праведзеная Генэральнай пракуратурай РБ, ня выявіла складу крымінальнага злачынства ў тэксьце кнігі Паўла Севярынца «Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі», сканфіскаванай супрацоўнікамі КДБ і МУС на прыватных кватэрах маладафронтаўцаў у Менску падчасператрусаў у лютым—сакавіку 2006 г. Болей за 70 асобнікаў кнігі вярнулі гаспадаром. Разам з тым яшчэ каля 40 кніг, сканфіскаваных у Магілёве, Наваполацку, Жлобіне, застаюцца ў мясцовых аддзелах міліцыі. Выдадзеная невялікім накладам, кніга прызначалася для прэзэнтацыі ў 12 беларускіх гарадох: некалькі зь іх сарвалі праз выбарчыя ператрусы.

Кніга «Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі» — аўтарская энцыкляпэдыя, складзеная з 200 найбольш вядомых фэномэнаў беларускасьці, дасьледуе нацыянальную ідэю як сутнасна хрысьціянскую. На вокладцы разьмешчаныя водгукі пісьменьніка Ўладзімера Арлова, паэта Генадзя Бураўкіна, гісторыка Анатоля Грыцкевіча й пастара Эрнэста Сабілы. «Нацыянальная ідэя...» фігуравала ў сьпісе «Лепшыя кнігі — 2005» тыднёвіку «Наша Ніва» й атрымала мэдаль Міколы Ермаловіча ад клюбу «Спадчына».

Пакуль кнігу Паўла Севярынца можна прачытаць у Інтэрнэце на ягоным асабістым сайце www.sieviarynets.net, або на ўэб-старонцы Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі www.bchd.info.

**КС**



# Выбары гуртам і ўраздроб

Мікалай Лазавік не ўтрымаў шыла ў мяху: скарачэньне кампаніі «будзе судзейнічаць захаваньню сацыяльна-палітычнай стабільнасьці ў грамадзтве».

Здавалася б, ці такі ўжо страх гэтыя мясцовыя выбары? Іх сярод паспалітага люду ня кожны і заўважае. Камэнтуючы сьвежыя зьмены ў выбарчым заканадаўстве, чыноўнікі найперш хваліліся, колькі грошай пашэнціць ашчадзіць на адмене другога туру. Але ж вось сакратар ЦВК Мікалай Лазавік ня здолеў утоіць шыла ў мяху: маўляў, скарачэньне кампаніі «будзе судзейнічаць захаваньню сацыяльна-палітычнай стабільнасьці ў грамадзтве».

Вось яно, саскочыла! На думку палітоляга Валера Карбалевіча, нават пры такой адладжанай машыне галасаваньня наверсе баяцца любых выбараў як патэнцыйнага форс-мажору. Бо дзеля блізіру мусіш даваць апанэнтам каліва магчымасьцяў. Адсякаючы другі тур, зьмяншаюць рызыку. Гэтую практыку могуць пашырыць і на парлямэнцкія выбары, і нават на прэзыдэнцкія, мяркуе Анатоль Ляўковіч з БСДП.

Па вялікім рахунку, мажарытарная сыстэма змушае значна карэктаваць палітычныя тэхналёгіі, зазначае Валер Карбалевіч. Не абавязкова спадабацца ўсім, можна засяродзіцца на мэтавых групах, здольных даць адносную бальшыню галасоў.

Але апазыцыя, схаваўшыся за тэзу, што ў нас выбары немагчымыя апрыёры, здаецца, увогуле адключылася ад барацьбы. Адзін правадыр выклікае другога на палемічны двубой. Жэсты прыгожыя, але ж высьвятленьню стасункаў ня бачна канца-краю.

Відавочна, аб’яднаныя дэмакраты ўжо мусілі б выходзіць шчыльнымі шэрагамі на чарговую палітычную кампанію. Насамрэч ідуць хто ў лес, а хто па дровы. Хтосьці ж увогуле заяўляе, што ў такія гульні могуць гуляць толькі дурні.

Вярхі хочуць выйграць выбары гуртам, апазыцыя прайграе ўраздроб.

Між тым фактычна не заўважылі, што ўлада пайшла на саступку міжнароднаму ціску. Прэзыдэнцкім указам рэгістрацыйны прынцып дзейнасьці прафэсійных зьвязаў зьмяняецца на цывілізаваны — заяўны, як таго патрабуе Міжнародная арганізацыя працы. Афіцыйны Менск ратуецца ад санкцыяў Эўразьвязу. Наіўна думаць, што цяпер спадарам Ярашуку ды Фядынічу будзе раздольле што да разгортваньня незалежных прафзьвязаў. Але ж, бач, і рэжым мусіць схамянуцца, калі паказычуць ахілесаву пяту (адмена прэфэрэнцыяў пагражае стратаю соцень мільёнаў эўра).

Зьвярніце ўвагу і на паводзіны беларускіх уладаў у кантэксьце канфлікту Масквы з Тбілісі. Памятаеце, летась, засьцерагаючыся экспарту рэвалюцыі ружаў, нашы дзеячы пагражалі грузінам візавым рэжымам? Цяпер жа, хоць расейцы і падштурхоўваюць, Менск не сьпяшаецца. Тутэйшае кіраўніцтва, мусіць, ужо экстрапалюе і на сябе тую імпэрскую гістэрыю, што пасьля арышту ГРУшнікаў за Каўкаскім хрыбтом паперла з расейскай кіроўнай эліты, як смурод з каналізацыі. Калі нават Грузіі, гэтай адрэзанай празаходняй лусьце, Крэмль мэнтальна адмаўляе ў праве на сваю палітыку, дык на якія, да д’ябла, сувэрэнныя правы можна спадзявацца ў «саюзнай дзяржаве»? Застаецца адно што паглыбляць акопы.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Дажынкі ў Бабруйску 6 кастрычніка (уверсе)…



PHOTO.BYMEDIA.NET



…і на Гарадзеншчыне.



# Дажынкі-2006 да нашай эры



Гумарэска **Лёліка Ушкіна.**

Відавочна, сьвята «Дажынкі» мае даўнюю традыцыю, і можна сьмела рэканструяваць, як выглядаў сьпіч правадыра племені са стаянкі Юравічы падчас сьвяткаваньня «Дажынак» недзе ў 2006 г. да н.э.

«Добры дзень, шаноўныя супляменьнікі. Дазвольце лічыць сьвята «Дажынкі-2006 да н.э.» адкрытым.

Хацелася б пачаць свой выступ зь невялічкага экскурсу ў гісторыю.

Прыгадаем, што яшчэ некалькі тысячагодзьдзяў таму, падчас ледавіковага пэрыяду, гаворка ішла проста аб выжываньні нашага племені.

Таму зь першых дзён свайго правадырства я блізка да сэрца прыняў трывогі супляменьнікаў, на якіх самым нэгатыўным чынам мелі ўплыў непрадуманыя рэформы ў выніку пераходу на аседлы спосаб жыцьця.

Калі мы пачыналі «Дажынкі», давялося пачуць шмат скептычных рэплік з боку апазыцыі. Быццам гаспадарка ляжыць пластом і ніякіх пэрспэктываў у ёй няма. Чым закапваць зерне ў зямлю — гэтак яны называлі бюджэтную падтрымку стаянак, — можна выраблять зааморфныя фігуркі і мяняць іх у суседніх плямёнаў на мяса мамантаў.

Аднак чужым мамантам сыты ня будзеш!

Аб якой прадуктовай бясьпецы племені можна гаварыць, калі цалкам залежыш ад паставак з суседняга лесу?

Нельга не адзначыць стымулюючай функцыі «Дажынак». Пераможцы становяцца героямі наскальных малюнкаў, на іх хоча быць падобная моладзь. Стаянка, якая набывае права прымаць «Дажынкі», перажывае другое нараджэньне: адрамантаваныя зямлянкі, добраўпарадкаваныя шалашы, абсталяваныя магільнікі і пасаджаныя на калы вязьні варожых плямёнаў.

Прыемна адзначыць, што свой унёсак у сьвята зрабілі самі жыхары стаянак: яны тройчы выходзілі на суботнікі.

Яшчэ адна добрая традыцыя «Дажынак» — пакідаць пасьля сябе нейкі значны аб'ект. Для нашай стаянкі гэта курган. Там можна пахаваць аднаго правадыра і 70 рабоў, якія будуць суправаджаць яго ў замагільнае царства. Хацеў бы прыгадаць, што ўсе курганы ў нашым племені — рэнтабэльныя!

Перш чым удзельнікі агульнаплемяннога спаборніцтва атрымаюць узнагароды з рук правадыра — касьцяныя пацеркі,— хачу адказаць на магчымыя пытаньні аўдыторыі.

Што да магчымых эканамічных санкцый з боку балтаў, то я скажу так: перажывём — галоўнае, каб таваразварот ня лясануў, а ён ня лясьне, бо мы штодня прыносім ахвяру богу Таваразвароту.

Тут задавалі пытаньне: што мы будуем, ці не жадаем мы вяртаньня ў час дыназаўраў? Я скажу так: выміраньне дыназаўраў было вялікай катастрофай для ўсёй зямлі, і мы павінны ўзяць усё найлепшае з таго часу, напрыклад, плазуноў.

Таму, у цэлым пазытыўна ацэньваючы працу племені, падкрэсьлю: час выходзіць на ўзровень перадавых афрыканскіх плямёнаў — Тамбукту, Ганы, Канэма, Борну і Конга.

А цяпер запрашаю вас усіх на вялікае гала-паяданьне зорак айчыннай і трыпольскай эстрады!

Смачна есьці! Дзякуй за ўвагу».

# Ці хочам мы татальнай мабілізацыі?

Беларусь працягвае шукаць сабе ворагаў. Піша **Віталь Тарас**.

Пэдафіл забівае пяць школьніц, захопленых ім у закладніцы ў амерыканскай рэлігійнай грамадзе амішаў.

Вэнэсуэльскі лідэр Уга Чавэс з трыбуны ААН называе прэзыдэнта ЗША д'яблам і заяўляе, што пасьля ягонага перабываньня ў залі пленарных паседжаньняў «патыхае серай».

Папа выказвае глыбокую павагу да ісламу ў прысутнасьці паслоў мусульманскіх краінаў сьвету падчас аўдыенцыі ў Ватыкане. Такім чынам галава рыма-каталіцкай царквы спрабуе ўлагодзіць канфлікт, выкліканы цытаваньнем у сваёй ранейшай лекцыі крытычнага выказваньня сярэднявечнага бізантыйскага імпэратара датычна прарока Мухамэда.

Бэрлінскі тэатар здымае ў апошні момант абвешчаную прэм'еру опэры. Прычына — у пастаноўцы ёсьць сцэна, дзе герой, паводле рэжысэрскай задумы, прамаўляе перад адрубленымі галовамі Хрыста, Буды і прарока Мухамэда.

Падобныя эпізоды БТ (але зразумела, ня толькі гэты канал) паказвае ў выпусках навінаў сярод першых сюжэтаў.

## Два польскія шпіёны і ня толькі

Здавалася б, што нам, у Беларусі, мусульманскі Ўсход? Што нам папа, іранскія аятолы, войны шыітаў і сунітаў у Іраку, амэрыканскія амішы? Чаму так навязьліва прапануюць нам з экранаў тэлебачаньня сюжэты аб рэлігійных і этнічных канфліктах? Задача тых, хто фармуе праграмы тэле- й радыёэтэру, думаецца, ня толькі ў тым, каб паказаць Беларусь «востравам стабільнасьці» ў сьвеце войнаў, тэрактаў і рэвалюцыяў.

Справа ў тым, што дзяржава, пабудаваная на прынцыпах герархіі, на аўтарытэце першай асобы замест аўтарытэту права й закону, ня зможа існаваць доўга, калі грамадзтва ня будзе ўвесь час мабілізаванае й згуртаванае вакол лідэра замежнай або ўнутранай пагрозай. Выглядае на мірнае жыцьцё — усялякія там «дажынкі», конкурсы прыгажосьці, аўтасалёны і г.д. Але ўнутрана, калі глядзець і чытаць дзяржаўныя СМІ, адчуваецца нейкая напятасьць, прадчуваньне хуткага канца сьвету, разам зь якім адыдуць у нябыт конкурсы з усімі прыгажунямі разам. І гэта ўжо ня толькі прадчуваньне…

Цяпер няма гаворкі пра якіх-небудзь польскіх ці грузінскіх шпіёнаў. (Хоць і яны, зразумела, прыдадуцца пры выпадку, як і «тэрарысты» з «Партнэрства» альбо «Маладога фронту».) Злучаныя Штаты, хоць і звыклы для беларускіх ідэёлягаў аб'ект для стварэньня аблічча ворага, але ён ужо не такі дзейсны. Менавіта праз сваю звыкласьць. Акрамя таго, па вялікім рахунку, Беларусь ніколі не належала й не належыць да прыярытэтаў замежнай палітыкі Белага дому. А таксама і для Эўразьвязу. Не адтуль ідзе галоўная пагроза.

Куды больш зручныя аб'екты для маніпуляцыяў на пачуцьцях беларускіх гледачоў найбліжэйшыя суседзі — Украіна, Польшча, Латвія. Там хапае рознага роду канфліктаў, супярэчнасьцяў інтарэсаў паміж асобнымі групоўкамі, сацыяльнымі групамі і цэлымі клясамі, якія толькі нараджаюцца. Можна палохаць беларускіх грамадзянаў высокімі цэнамі, масавым беспрацоўем, абмежаваньнем правоў расейскамоўнага насельніцтва (самае страшнае, што толькі можа прысьніцца абывацелю ў Беларусі), гомасэксуалізмам і рознай іншай экзотыкай. Але ж і суседнія краіны не надаюцца да ролі галоўнага ворага.

## Скаваныя адной мовай

Апошнім часам пачала адбывацца свайго роду інфляцыя «страхаў». Ну, што зробіш: Беларусь — не Ўкраіна, не Прыбалтыка. Пакуль што частка насельніцтва ўспрымае іх як былую частку вялікага Савецкага Саюзу, але ўсё больш людзей лічаць існаваньне новых незалежных дзяржаваў звычайнай дадзенасьцю. Мы не яны, яны ня мы.

Але ж застаецца Расея. Расея, зь якой беларуская ўлада хоча, але ніяк ня можа разарваць стасункаў. Бо застаецца як бы яе целам, генэтычным спараджэньнем расейскай імпэрскай адміністрацыі зь яе традыцыямі, звычаямі, сыстэмай каштоўнасьцяў. Яны, беларускія й расейскія чыноўнікі, нават гавораць на адной мове — і ў літаральным сэнсе таксама. Гэтыя дачыненьні можна было б ахарактарызаваць як любоў — нянавісьць. На гэтых струнах — то любові, то нянавісьці — можна было час ад часу граць, у залежнасьці ад патрэбы дзяржавы.

Але ж у Беларусі вырасла ўжо цэлае пакаленьне, якое ня ведае, што такое імпэрская Расея, чым быў СССР, ня ведае, што сэрца чамусьці павінна трымцець ад словаў «Масква», «Крэмль», «Красная плошча». Новае пакаленьне яшчэ не адчула напоўніцу, што жыве ў незалежнай Беларусі, але яно дакладна ўжо не жыве ў СССР. Не жыве яно і ў Расеі ці нават разам зь ёй, хоць і глядзіць расейскія тэлеканалы ды слухае расейскую папсу.

Старое пакаленьне — пакаленьне вэтэранаў вайны — сыходзіць. Новае пакаленьне ўсё меней схільнае верыць казкам пра вяртаньне ў страчаны рай, то бок у Савецкі Саюз. Таксама яно ня верыць ужо й казкам пра Эўразьвяз, часткай якога, нібыта, можа некалі зрабіцца Беларусь.

Чым запоўніць той ідэалягічны




**Бабруйск, 6 кастрычніка. Гледачы Дажынак.**

вакуўм, у якім апынулася значная частка беларускага грамадзтва? Лягічна, здавалася б, не рабіць кампіляцыі з старых савецкіх падручнікаў пад выглядам дзяржаўнай ідэалёгіі, а вярнуцца да гістарычных каранёў, да роднай мовы, заняцца выхаваньнем сапраўднага патрыятызму на прыкладах айчыннай гісторыі. Але ж рост нацыянальнай самасьвядомасьці пагражае тым, што ў народзе можа прачнуцца пачуцьцё ўласнае годнасьці. А гэта сьмяротна небясьпечна для ўлады.

## Крамлёўскі паралюш

Застаецца ўзрошчваць пачуцьцё нянавісьці, замяшанай на страху. Расея — вось, насамрэч, годны маштабу амбіцыяў кіраўніка Беларусі вораг. Прычым вораг рэальны, блізкі, не прыдуманы штатнымі прапагандыстамі… Дастаткова ўключыць тэлевізар, каб расейская ўлада паўстала з экранаў ва ўсёй сваёй прыгажосьці. Усе конкурсы прыгажунь, КВЗ і фільмы жахаў разам узятыя — нішто на тле расейскай палітыкі і палітыкаў.

Калі кіраўнік дзяржавы кажа, што Беларусь можа стаць для Расеі чымсьці горшым за Чачэнію, ён ня проста палохае Расею. Ён малюе адзін з мажлівых сцэнароў будучыні. Пасьля антыгрузінскай гістэрыі, якая пачалася на самым версе і хутка ахапіла, падобна чуме, усё расейскае грамадзтва, пасьля таго, як міліцыя пачала перасьлед грузінскіх бізнэсоўцаў і артыстаў, пасьля таго як грузінаў, улучна з малымі дзецьмі, пачалі высылаць грузавымі самалётамі, як быдла, у Тбілісі — пасьля ўсяго гэтага кожнаму нармальнаму чалавеку ясна, што ад Расеі можна чакаць усяго, што хочаце. Няма такога злачынства альбо такога ідыятызму — называйце, як хочаце, на які ня здольнае было б крамлёўскае кіраўніцтва. Галоўнае, каб гэты ідыятызм быў прыкрыты «нацыянальнымі інтарэсамі» альбо называўся «нацпраектам».

Ці напалоханы быў такімі неадэкватнымі паводзінамі Крамля афіцыйны Менск? Думаецца, ніколькі. Хутчэй, Крэмль выглядае напалоханым заявамі Лукашэнкі наконт магчымага разрыву стасункаў з Расеяй. Толькі паралюшам страху можна патлумачыць адсутнасьць якой-небудзь рэакцыі Масквы на фактычны ўльтыматум кіраўніка Беларусі: альбо газ па ранейшых цэнах, альбо разрыў. Больш за тое, складваецца ўражаньне, што абсурднымі санкцыямі супраць Грузіі Крэмль кампэнсуе сваю імпатэнтнасьць у замежнай палітыцы — у прыватнасьці, што да Беларусі, зь якой увогуле невядома, што рабіць.

Вядома, ні ў дачыненьнях з Грузіяй, ні ў дачыненьнях зь Беларусьсю расейская палітычная эліта дагэтуль не навучылася паводзіць сябе як з роўнымі сувэрэннымі партнэрамі. Сама думка аб тым, што «братняя Беларусь» усьлед за Украінай можа адкалоцца ад Масквы, прыводзіць расейскіх палітыкаў амаль у панічны стан. Разрыў зь Беларусяй, адрозна ад разрыву з Грузіяй, азначаў бы для расейскай палітычнай эліты сапраўды «канец імпэрыі», поўную катастрофу.

**Працяг на старонцы 20.**

# Ці хочам мы татальнай мабілізацыі?

Працяг са старонкі 19.

## Памылка рэзыдэнта

Тое, што Міхаіла Саакашвілі Крэмль крывадушна параўноўвае зь Берыям і Сталіным, а кіраўніку Беларусі загадзя даруе ўсе мінулыя і будучыя падтасоўкі на выбарах, арышты, разгоны дэманстрацыяў, закрыцьцё газэт, парушэньні правоў чалавека, гаворыць само за сябе. Масква гатовая пасварыцца з кім заўгодна, калі палічыць, што гэта адпавядае яе інтарэсам. Але з Лукашэнкам яна сварыцца ня можа. Ён сапраўды ёсьць апошняй надзеяй Крамля. Прынамсі, быў ёй да апошняга часу. Прызнаньне памылковай стаўкі на Лукашэнку стала б для Масквы прызнаньнем у поўным правале замежнай палітыкі былога рэзыдэнта КГБ Пуціна.

Якая выгада ад гэтага Лукашэнку? Калі б на ягоным месцы быў які-небудзь іншы палітык, можна было б меркаваць, што справа абмяжуецца шантажаваньнем «Газпрому» і скончыцца, урэшце, палюбоўным пагадненьнем бакоў. Але высновы некаторых палітолягаў аб тым, што бліжэйшыя два гады, пакуль у Расеі пройдуць парлямэнцкія і прэзыдэнцкія выбары, Лукашэнка будзе ціха адседжвацца ў Менску, выглядаюць пасьпешлівымі. Менавіта ў пэрыяд выбараў, які ў Расеі абяцае стаць пэрыядам палітычнай нестабільнасьці, Лукашэнка (ён гэта не аднойчы даводзіў раней) можа актывізаваць свае спробы заваяваць Маскву, дамагчыся вышэйшай улады на ўсёй постсавецкай прасторы. На меншае ён проста не пагодзіцца.

Ці ёсьць у яго шанец? Калі расейскія палітолягі скідваюць кіраўніка Беларусі з рахункаў, то яны зыходзяць са старой формулы: «гэтага ня можа быць, бо гэтага ня можа быць ніколі». Між тым, ніхто з тых палітолягаў, а таксама й палітыкаў ніколі не рабіў спробаў разгледзець гіпатэтычную магчымасьць прыходу Лукашэнкі да ўлады ў Расеі ўсур’ёз. Проста з-за таго, што ніхто зь іх ня ў стане разглядаць палітыкаў, якія не «тусуюцца» ў межах Садовага Кальца, як суб’ектаў, вартых іхнай пэрсанальнай увагі. Звычайная для расейскіх саноўнікаў і палітолягаў пыха не дазваляе ім бачыць нешта, што не ляжыць пад носам. Хаця гісторыя расейскай імпэрыі мае нямала прыкладаў, калі да ўлады ў Маскве прыходзілі самазванцы з замежжа ці правінцыялы — сярод іх, быў, напрыклад, адзін сэмінарыст з Грузіі…

Нестабільнасьць, рост узаемнай нянавісьці й ксэнафобіі ў сьвеце, злачыннасьць і карупцыя ў Расеі, пагроза новай вайны на Каўказе, а яшчэ лепей — пагроза глябальнай вайны (магчыма, атамнай) пад рэлігійнымі сьцягамі, з удзелам краінаў Азіі, Эўропы і ЗША — вось той грунт, на якім папулярнасьць Лукашэнкі ў Расеі можа расьці. Лёс самой Беларусі, бадай, у найменшай ступені займае яе кіраўніка. Інакш ён і ў думках ня стаў бы прадказваць сваёй краіне будучыню, у параўнаньні зь якой Чачэнія можа падацца «мяккім варыянтам».

Яшчэ некалькі гадоў таму сапраўды здавалася, што Беларусь — самая спакойная частка былога СССР. Цяпер, дзякуючы ў тым ліку намаганьням і памкненьням яе першага прэзыдэнта, магчымасьць вайны на эўразійскай прасторы з удзелам Беларусі ўжо не здаецца зусім прывіднай. Уключыце вашыя тэле- й радыёпрымачы. Аднойчы мы можам пачуць: «Ці хочаце вы татальнай мабілізацыі?»

# Спачатку — палітычных, за імі — рэлігійных

У Баранавічах пастара аштрафавалі за «несанкцыяванае хрышчэньне». Піша **Аляксей Шэін.**

Арышт і заключэньне пад варту сяброў «Партнэрства», а цяпер і Зьмітра Дашкевіча, прымушае задумацца як тых, хто «займаецца палітыкай», так і частку беларускіх пратэстантаў. Арт.193 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае зьняволеньне за ўдзел ня толькі ў незарэгістраваных *грамадзкіх*, але і *рэлігійных* арганізацыях. А ў Беларусі цяпер адных толькі пратэстанцкіх цэркваў, якія ня маюць рэгістрацыі, — блізка 200.

Аўтар, які пісаў перад Новым годам гэтае дапаўненьне ў Крымінальны кодэкс, безумоўна, выконваў выразна пастаўленую задачу. І сьвядома прапісаў: *грамадзкія* і *рэлігійныя*. Улада разважыла, што трэба абавязкова дапоўніць свой закон менавіта такім чынам. Для чаго тут чапаць рэлігію — можна толькі варажыць.

Ва ўсялякім разе, вернікі царквы, якая можа пазбавіцца рэгістрацыі за залішнюю актыўнасьць ці ідэалягічную «няправільнасьць», акуратна падпадаюць пад «крыміналку».

Акрамя таго, грамадзкая актыўнасьць эвангельскіх хрысьціянаў падчас сакавіцкіх падзеяў 2006 г. і пасьлясакавіцкая дапамога рэпрэсаваным (без падзелу іх на *вернікаў* і *нявернікаў*) паказала, што пратэстанты не ўваходзяць у пералік слупоў, на якіх сёньняшняя ўлада можа абаперціся…

Ёсьць такі артыкул у Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэньнях — 167. Прадугледжвае адміністрацыйнае пакараньне за несанкцыяваныя сходы: *грамадзкія* і *рэлігійныя*. Спачатку паводле яго садзілі на суткі і штрафавалі толькі апазыцыянэраў. «Рэлігійная» частка гэтага артыкулу прастойвала да лепшага часу. Аднак цяпер пачалі судзіць ды садзіць і пратэстантаў: некалькі пастараў і царкоўных лідэраў ужо адседзелі на Акрэсьціна за тое, што памаліліся Богу бяз санкцыі на тое сьвецкіх уладаў; у Баранавічах пастара не малой царквы (на богаслужэньні прыходзяць 1500 сяброў, а ў нядзельнай школе навучаецца да 1000 дзетак) аштрафавалі на чатыры мільёны рублёў — за несанкцыяванае хрышчэньне.

Цяпер вось уведзены і крымінальны артыкул. Улада зноў пачала з «палітычных».

## Ня трэба прасіць

**«НН» прапанавала чытачом зьвярнуцца да дырэктара «Белпошты» і папрасіць уключыць газэту ў падпісны каталёг на 2007 год.** Здаецца, справа вартая падтрымкі, бо ўсім зразумела, наколькі гэта цяжка — распаўсюджваць выданьне ў цяперашняй сытуацыі. Але ўсё ж. У каторы раз *нас* заклікаюць *прасіць іх*. Вось гэтага я прыняць і не магу. Колькі можна прасіць уладу пра тое, што яна проста абавязана забясьпечыць. Трэба патрабаваць, бо мы, чытачы і падпісчыкі «НН», — грамадзяне Беларусі. Дзяржава павінна паважаць і абараняць нашы правы. Зразумела, што абараняюць і паважаюць *яны* толькі сябе і сваіх «братоў па розуме», а беларускасьць ім як костка ў горле. Тым больш трэба паказаць людзям, што незалежніцкі рух — гэта сіла, а дзеля гэтага неабходна дзейнічаць рашуча, а не прасіць. Якуб Колас яшчэ ў паэме «Сымон-музыка» пісаў:

А як стане не ў трываньне,
І тады чакаць пакорна,
Покі стане жыць прасторна?
А змаганьне? Дзе змаганьне?
Ой, не, дзедку: *працій сілы*
Можна ставіць толькі сілу,
Калі хочаш ты ўстаць з пылу,
Калі цягнуць зь цябе жылы...

А то зьбіраемся перамагчы рэжым і... просім памяшканьне для кангрэсу ў Лукашэнкі, кажам пра незаконнасьць прысудаў і... сплачваем штрафы, арганізуем Чарнобыльскі шлях і... зноў просім дазволу!

Вось і Саюзу беларускіх пісьменьнікаў карэспандэнт «НН», а потым і А.Трусаў (у інтэрвію «Свабодзе») прапанавалі абвясьціць збор сродкаў для ўратаваньня Дому літаратара. У прыклад ставілася сытуацыя з «Народнай воляй». Сабралі 6 сродкі, заплацілі, і няўжо нехта думае, што ўсе праблемы на гэтым бы й скончыліся? Не стваралі 6 тады ўлады «чэснага» саюзу з чаргінцамі і скобелевымі. Прыклады можна доўжыць бясконца, але відавочна адно: рэжым панічна баіцца палітыкаў, якія адкрыта ідуць на сутыкненьне, дзейнічаюць сьмела і гатовыя ісьці да канца. Думаю, што прыклад Аляксандра Казуліна яскрава гэта прадэманстраваў. А спадарам Мілінкевічу, Вячорку, Лябедзьку і іхняму бліжэйшаму атачэньню пара вызначыцца, за што яны змагаюцца.

Калі яны выступаюць за абарону правоў, захаваньне беларускай культуры, распаўсюд праўдзівай інфармацыі (што я толькі вітаю!), але сваімі дзеяньнямі дэ-факта прызнаюць легітымнасьць рэжыму — гэта адно; калі ўсё ж такі яны змагаюцца за ўладу ў краіне, ідучы лоб у лоб з рэжымам, — гэта зусім другое.

P.S. З радасьцю далучуся да ініцыятывы «НН», калі рэдакцыя зьменіць фразы: «Прашу ўключыць...» і «Прашу пры фармаваньні...» на «Патрабую ўключыць...» і «Патрабую пры фармаваньні...» адпаведна.

**Дзяніс Рабянок, Калінкавічы**

**Ад Рэдакцыі.** Фармулюйце на Ваш густ і розум, спадару.

## Самая моцная — партыя бацькоў

**На плошчы 19 сакавіка і на Дзень волі 25-га мы былі агромністай шматтысячнай грамадой.**

Дык чаму ж мы такой жа грамадой ня пойдзем да судоў, дзе катуюць нашу моладзь?!

Чаму ж мы па праве бацькоў, якія далі жыцьцё сваім дзецям, ня спынім рэпрэсіўнай машыны? П.Севярынец пісаў у адным зь лістоў: «Самая моцная — гэта партыя бацькоў!»

Прароча сказаў паэт у радку: «Звыклі ўсе да ахвяр у нязвыклай ахвярні...»

Гэтая нашая звычка і маўклівая згода вядзе да таго, што новыя людзі трапляюць за краты.

Шаноўныя журналісты, паведамляйце, калі ласка, загадзя, рабіце абвесткі, дзе будзе суд над Зьмітром Дашкевічам і яго таварышамі.

Дарагія людзі, ня думайце, што гэта апошняя ахвяра. З экрану БТ Чаргінец абвясьціў жаданьне вышэйшых: знайсьці і пакараць таго героя, які ўсталяваў на плошчы шыбеніцу з падручнікам гісторыі Беларусі. А гэты ж хлопец выказаўся за ўвесь народ: хіба можна вяртацца да ранейшых часоў і рабіць замах на мову і на гісторыю?!

Падтрымайма сьмелых юнакоў!

**Мама «МФ», Менск**

## ЖАРТ

*«Мы поддерживаем белорусский язык, там, где надо, но не настолько, чтобы люди забыли русский».*
*А.Лукашэнка расейскім журналістам.*

Я русский забуду лишь только за то,
Что им говорил Лукашенко.

**Сяржук Вітушка, Вільня**

## З ІНТЭРНЭТУ

# Накарміць Дашкевіча

**Такі допіс быў зьмешчаны на блогу «Беларуская Благасфэра»**

Учора з Касьперам занесьлі чарговую перадачу Зьмітру. «25,5 кіляграмаў», — паведаміла цётка ў камуфляжы. Значыцца, да канца месяца яму можна перадаць яшчэ 4,5 кг. Не, уявіце сабе, за 4 дні месяцу амаль вычарпалі ўвесь ліміт!

Нясуць знаёмыя, сядзельцы па намётаваму лягеру, пратэстанты і проста неабыякавыя людзі. Прычым многія перадаюць вараную бульбу, мандарыны, яблыкі і гуркі зь лецішча... Ну не разумеюць людзі, што праз гэта наш Дзімачка будзе галадаць наступныя тры тыдні!!! Не каб папярэдне запытацца, што яму трэба. А то тэлефануюць і дакладаюць: «Я тут Дашкевіча пакарміла, вінаградзіку яму занесла…» А заўтра ліміт будзе вычарпаны, і мы ня здолеем перадаць яму нават самае неабходнае. Мы з Палажанкай стаміліся з гэтым змагацца. Дзіма называе гэта «прадуктовай вайной». Народ, пішыце лепш лісты, а накарміць Дашкевіча — мы накормім!

На месяц кожнаму сядзельцу дазволена атрымаць перадачаў на 30 кг. Гэта кіляграм на дзень. У гэтую вагу ўваходзяць таксама вопратка і сродкі гігіены, таму прыходзіцца выбіраць — ці швэдар, ці сала. З гэтай прычыны ёсьць сэнс перадаваць прадукты, якія важаць мала: распушчальныя кашы, сухую кілбасу, «ралтоны». Дзіма патрабуе больш кніг, кажа, што лепш есьці менш будзе. Але на кнігі ўжо кіляграмаў не засталося :).

Увогуле, парадкі на Валадарцы — асобная гісторыя. Існуюць правілы, паводле якіх амаль уся ежа перадаецца ў празрыстых пакетах. Кашкі перасыпаем, цукеркі разгортваем, мёд у плястыку заклейваем скотчам, пюрэ распушчальнае чамусьці нельга. Як нельга звычайныя сродкі для і пасьля галеньня — дазваляюць толькі ў тубіках (відаць, падтрымліваем айчыннага вытворцу:).

Каб зрабіць паўнавартасную перадачу, трэба правесьці пад сьценамі СІЗА не адну гадзіну. Лекі прымаюць з 12-й да 13-й гадзінаў (пн, ср, пт). Перапынак на абед — з 13-й да 14-й. Кнігі прымаюць з 14-й да 15-й. Каб перадаць ежу, трэба адстаяць нялюдскую чаргу. Карацей, на працу і асабістыя справы ў дзень перадачы можна забыцца.

Лісты да Зьмітра ідуць 5 дзён, усё, што з навінамі, цэнзары пускаюць у сьмецьце, праверана. Прапускаюць толькі сюсюсю, ляляля, размовы пра надвор'е. Думаю, набыць яму якіх паштовак, усё весялей будзе. Перадала капэртаў з падасінавічкамі — ён мне ўсё абяцаў, што пойдзем у грыбы. А цяпер піша, што мае чуйку, што восень-2008 будзе грыбной. Во гад, а? Вернецца ж раней, стопудова. Ну, мы, прынамсі, чакаем.

## З ПОШТЫ РЭДАКТАРА.

# Страх адказвае

Паведамляем, што сустрэча з рэдакцыяй газэты «Наша Ніва», заплянаваная Вамі (...) на 13 кастрычніка 2006 г. не адбудзецца. Бібліятэка працуе па загадзя складзеных плянах, і 13 кастрычніка будзе праходзіць комплекс мерапрыемстваў па павышэньні кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў.

**Дырэктар Маладэчанскай РЦБС В.П.Страх**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# «Рускія» здаюць пазыцыі ў Латвіі

Прарасейская партыя «ЗаПЧЕЛ» ледзьве прайшла ў сойм.

Пасьля падліку бюлетэняў на ўсіх выбарчых участках высьветлілася, што перамогу здабыла кіроўная Народная партыя (19,3% галасоў), на другім месцы фінішаваў іншы ўдзельнік урадавай кааліцыі, Саюз «зялёных» і сялянаў (16,6%), на трэцім — апазыцыйная лібэральная партыя «Новы час» (16,2%). Гэтыя тры партыі атрымаюць адпаведна 23 і 18 месцаў у парлямэнце (з 100 магчымых).

Першую тройку апытаньні грамадзкае думкі прадказвалі цягам прынамсі апошняга месяца. Затое чацьвёртае месца, якое сацыёлягі аддавалі леваму аб'яднаньню «За правы чалавека ў адзінай Латвіі» («ЗаПЧЕЛ»), нечакана дасталося канкурэнтам «пчолаў» — «Цэнтру згоды», праход якога ў сойм раней быў пад пытаньнем.


AP
Аігарс Кальвіціс, прэм'ер Латвіі, захавае сваю пасаду.

«Згода» набрала 14,3% галасоў і цяпер можа атрымаць 17 месцаў у парлямэнце. Частку галасоў расейскамоўных выбарцаў адцягнулі Латвійская першая партыя і саюз «Латвійскі шлях», які з 8,5% галасоў можа прэтэндаваць на 10 дэпутацкіх месцаў. Апроч іх пяціадсоткавы бар'ер пераадолелі палітычныя антыподы: нацыяналістычная партыя «Айчыне і свабодзе»/ДННЛ (6,9% галасоў, 8 месцаў у парлямэнце) і «ЗаПЧЕЛ» (6%, 6 месцаў у парлямэнце).

Трэцяя расейская партыя — «Радзіма» — нягледзячы на прысутнасьць у сьпісах В.Пуціна, пацярпела паразу. З 2% галасоў Вадзім Пуцін і ягоныя таварышы па партыі засталіся па-за парлямэнтам.

Такім чынам, кіроўныя латыскія партыі ўжо цяпер могуць сфармаваць кааліцыю, якая будзе абапірацца на 51 дэпутацкі голас. Пры такой мінімальнай большасьці латвійскі ўрад ужо працаваў, хаця і ня надта стабільна. Тэарэтычна для забесьпячэньня большай падтрымкі да фармаваньня кабінэту могуць прыцягнуць яшчэ адну правую партыю. Прарасейскія ж палітычныя сілы застануцца ў апазыцыі.

У дзень выбараў старшыня Народнай партыі, міністарка культуры Гелена Дэмакова заявіла, што «Цэнтар згоды», які пазыцыянуе сябе ў якасьці «канструктыўнай апазыцыі», у кааліцыю запрашаць ня будуць. Пра «ЗаПЧЕЛ» нават гаворкі няма — з гэтай партыяй латыскія палітыкі пакуль працаваць катэгарычна адмаўляюцца.

Так званае этнічнае галасаваньне, якое прадказвалі перад выбарамі палітолягі, гэтым разам было выяўлена куды слабей, чым звычайна: «Цэнтру згоды» і Латвійскай першай партыі ўдалося дастукацца да абедзьвюх аўдыторый. Перамогу «ЦЗ» палітолягі тлумачаць прадуманай кампаніяй, а таксама тым, што аб'яднаньню ўдалося забіць у свае шэрагі папулярнага ў пэўных колах насельніцтва лідэра Сацыялістычнай партыі, апошняга савецкага кіраўніка Рыгі Альфрэда Рубікса.

Пры гэтым ідэя згоды між расейскамоўнай і латыскай супольнасьцямі мае шмат прыхільнікаў.

Былы міністар грамадзкай інтэграцыі Ніл Муйжніекс адзначае, што посьпех «Цэнтру згоды» сьведчыць: радыкалізм і палярызацыя ў грамадзтве ўсё ж спадае.

**Паводле газета.ру**

# Фляндрыя рухаецца да незалежнасьці

Правая партыя «Флямандзкі блёк» атрымала на выбарах шці ні найлепшых вынікаў у сваёй гісторыі. Яны выступаюць за незалежнасьць Фляндрыі.

Што праўда, крайнія нацыяналісты з *Vlaams Belang* ня здолелі дасягнуць поўнага посьпеху ў Антвэрпэне, найбольшым горадзе Фляндрыі. Яны здабылі «ўсяго» 32,5%, крыху меней за сацыял-дэмакратаў. Таму цалкам уладу яны, бадай, ня возьмуць — астатнія партыі створаць «санітарны кардон»: шматпартыйную кааліцыю.

Але ў іншых акругах краіны *Vlaams Belang* атрымала лепшыя вынікі, чым шэсьць гадоў таму. У шэрагу камунаў, у тым ліку ў прыгарадзе Брусэлю, яна выйшла на першыя месцы.

Чым больш галасоў атрымліваюць флямандзкія правыя, тым большая верагоднасьць, што пачнецца паступовы дэмантаж Бэльгіі.

«Бэльгія сама па сабе ня ёсьць нейкай каштоўнасьцю», — сказаў нядаўна Іў Лянтэрн, хрысьціянскі дэмакрат, які займае пасаду кіраўніка рэгіянальнага ўраду Фляндрыі.

Партыі, што цяпер кіруюць Бэльгіяй — сацыялісты з Валёніі і флямандзкія лібэралы, — на нядзельных муніцыпальных выбарах атрымалі вельмі слабы вынік. Яны ня змогуць процістаяць разбурэньню Бэльгіі.


**А такая ў флямандцаў «Пагоня».**

Кароль Альбэрт II таксама бясьсільны, бо ня мае патрэбных канстытуцыйных паўнамоцтваў.

**Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**

# Юшчанка як Гамлет

Прычына паразы рэвалюцыі хаваецца ў асобе ўкраінскага прэзыдэнта, а надзея — у дзейнасьці пазапарлямэнцкіх сілаў і прэсы. Піша **Багдан Асадчук**.



**Віктар Януковіч і Віктар Юшчанка (справа).**

Думаю, што вельмі карысным будзе сур'ёзнае абмеркаваньне прычынаў паразы Памаранчавай рэвалюцыі. Гэта нялёгкая справа. Фактычна Ўкраіна не перажыла за ўвесь ранейшы пэрыяд незалежнасьці аніякай глыбокай дыскусіі пра асноўныя праблемы нядаўняй гісторыі. Пераход ад таталітарызму да пабудовы грамадзянскай супольнасьці адбываўся бязь ціску зьнізу, а хутчэй з імправізацыйных ідэяў мінулай кампартыйнай бюракратыі, якая падчас краху імпэрыі ды яе калёніяў жадала ня толькі перажыць гістарычныя нягоды, але і пераняць уладу мірным шляхам, бяз рызыкі крывавага канфлікту.

Новая-старая ўлада не была зацікаўленая дыскусіямі ані пра паходжаньне і вынікі камуністычнага таталітарызму, ані пра адказнасьць і пакараньне былых энкавэдыстаў і кагэбістаў, ані пра маральную і матэрыяльную кампэнсацыю ахвярам нечалавечай сыстэмы. А прадстаўнікі інфармацыйных службаў і прапаганды, якія карміліся ад камуністычнай бюракратыі, былі цалкам задаволеныя прасторам нацыянальнай сымболікі. Толькі адзінкі і малатыражныя часопісы імкнуліся выбрацца з сыстэмы новай калябарацыі.

Не прыносілі плёну і спробы разгарнуць дыскусіі пра дэмакратычны сацыялізм, лібэралізм і інтэгральны нацыяналізм АУН (Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў). Усё скончалася на ўзроўні «навукова-практычных канфэрэнцый».

Цяпер мы маем напаўразбуджанае грамадзтва, і цалкам мажліва, што будзе нагода заахвоціць людзей да сур'ёзнага разгляду ўсіх аспэктаў узьнікненьня і пазьнейшага змарнаваньня плёну Памаранчавай рэвалюцыі. Ня ўсё яшчэ высьветлена. Існуе багата гіпотэзаў, здагадак, падазраньняў, і няма яшчэ пакуль аналітычных працаў пра ўзьнікненьне, хаду і вынікі рэвалюцыі. Найлепшая з ранейшых публікацыяў — «Памаранчавая рэвалюцыя» — вядомага гісторыка Станіслава Кульчыцкага не дае поўных адказаў на згаданыя крытэры. Мабыць, давядзецца досыць доўга чакаць, пакуль усе элемэнты гэтай гістарычнай падзеі стануць вядомыя.

Але гэта не вызваляе нас ад абавязку і мажлівасьцяў ужо сёньня, перад завяршэньнем рэвалюцыйнага этапу ў эвалюцыі ўкраінскага дзяржаўнага працэсу, ставіць пытаньні датычна каляпсу Памаранчавай рэвалюцыі. У мяне наконт гэтага шмат думак, якія, пэўна, не зусім адпавядаюць пашыраным поглядам. Спачатку некалькі банальных заўваг. Папершае, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў ніхто з тагачасных апазыцыйных палітыкаў не казаў пра магчымасьць рэвалюцыі. Больш за тое, спантанная стыхія народнага пратэсту была нечаканай для пазьнейшых «герояў» рэвалюцыі. Толькі ўбачыўшы, што выбух грамадзтва можна выкарыстаць для здабыцьця ўлады, яны ўскочылі на рэвалюцыйны цягнік і такім чынам здабылі кіроўныя пасады.

А рэвалюцыя прайграла ў сэнсе замацаваньня сваіх пазыцыяў у рэфармаваньні дзяржавы. Яна не змагла стварыць сваіх інстытутаў, ухваліць праграмы-маніфэсту, нічога не арганізавала на карысьць Рэвалюцыйнага трыбуналу, які б мог стаць сумленьнем і стрыжнем рэвалюцыі. Гэтага не адбылося. Рэвалюцыя разьбеглася па хатах. А палітычныя дзеячы з «памаранчавых» шэрагаў вырашылі назьбіраць з гэтага групавы і асабісты капітал. Гэта, дарэчы, даволі рэдкі ў гісторыі палітычны падман. А паколькі рэвалюцыя не была творам палітычных партыяў (за выняткам новаўзьніклай і доўга не прызнаванай «Пары»), ніводная партыя і не адчувала абавязку абараняць рэвалюцыйную спадчыну.

Мабыць, асноўная прычына паразы хаваецца ў асобе прэзыдэнта Юшчанкі. Юшчанкаўскі «гамлетызм» генэтычнай нерашучасьці, роднасны патэрналістычна-правінцыйнаму падбору супрацоўнікаў, спалучаны (падобна як у колішняга амэрыканскага прэзыдэнта Джымі Картэра) з празьмерным уплывам на палітыку жонкі Кацярыны, прывёў, калі ўжыць даўні цынічны афарызм Леаніда Краўчука, да выніку «маем, што маем».

Замежныя экспэрты пішуць пра «трагічны вобраз украінскай рэвалюцыі», «ахвяру ўласных памылак», чалавека, ня здольнага да вялікіх рашэньняў, змарнаваны капітал вялікага даверу. Зьвяртаецца ўвага на элемэнт «палітычнага і маральнага прыніжэньня» датычна ранейшага суперніка Януковіча. «Як ён мог змарнаваць той вялізны капітал, які інвэставаў ва Ўкраіну ўвесь Захад, у тым ліку і Польшча?» — запытваўся ў мяне на сьвяткаваньні стагодзьдзя зь дня нараджэньня Ежы Гедройца былы міністар замежных справаў Польшчы Ўладыслаў Барташэўскі.

Паўстае пытаньне: якім чынам можна ўратаваць ідэалы і зьмест рэвалюцыі? На партыі ў Вярхоўнай радзе нельга спадзявацца, і тым меней можна спадзявацца на прэзыдэнта. Аднак ёсьць яшчэ надзеі на магчымасьці вольнай прэсы і грамадзкіх арганізацыяў і на стварэньне пазапарлямэнцкай апазыцыі.

**Пераклала Вольга Данішэвіч паводле часопісу «Критика»**

**Багдан Асадчук** — публіцыст, гісторык. Прафэсар Вольнага ўнівэрсытэту ў Бэрліне. У мінулым быў актыўным аўтарам легендарнага польскага часопісу «Культура», што выходзіў у Парыжы.

# Навіны даўнія і сёньняшнія,

## альбо Што зьмянілася на Вялейшчыне за апошнія 100 год.

I

**Хаценчыцы,** Вялейскага вуезду.

На другім тыдні вялікага посту выйшла такое здарэньне. Ішоў п'яны лясьнік Трусавіцкага лесу і ўвідзеў, што мужыкі насеклі воз ляшчыньнїку. Ён адабраў сякеру і расьсек каню морду. Нарабілі крыку. Наляцела болей мужыкоў і моцна патармасілі лесьніка. Цяпер завёўся суд.

**С.Маласаў. 1907. №14**

**Вёска Хаценчыцы,** Вялейскага раёну.

Стары пайшоў ранкам з хаты да хмызьняку нарубіць лазы на кашы. Няўдала пасьлізнуўся і ўпаў, зламаўшы нагу пры самае дарозе. Праляжаў на самоце цэлы сьветлы дзень. Глядзеў з пагорку на сваю колісь шматлюдную вёску, чакаючы дапамогі. Ледзь не замерз на сьмерць. Ніхто на бальшаку не зьявіўся за ўвесь дзень, толькі надвячоркам выпадкам дарогаю праехала адзіная машына заблукалага менчука. Ён і завёз дзеда да шпіталю.

**Наш час**

II

**Мястэчка Дунілавічы,** Вялейскага павету.

У нас і вакруг мястэчка надта цёмны народ... Граматных зусім мала, дый ня маюць звычаю чытаць. А купіць якую кніжку ці газэту — і не кажы!.. Лепш астатнюю мерку жыта за гарэлку аддадуць...

**М.Шпэктар. 1907. №25**

**Мястэчка Дунілавічы,** Пастаўскага раёну.

Каля газэтнага шапіка сустрэліся дзьве кабеты. Адна папытала ў гандляра «Крымінальны агляд», а другая сказала, што ёй больш даспадобы «Прыватны дэтэктыў». Ні адна з аматарак чытва за жыцьцё, мусіць, не наведала сапраўднае кнігарні і тым больш не набыла аніводнае беларускае кніжкі. А тым часам надоечы ў райцэнтры адсьвяткавалі Дзень беларускага пісьменства.

**Наш час**

III

**Мястэчка Лебедзева,** Вялейскага павету.

Нядаўна ў маёнтку «Малінаўшчызна» да пана Сьветажэцкага прыйшло жаць нешта каля дзьвюх сотняў баб. Да таго дня ім плацілі па тры злоты ў дзень, а цяпер ім сказалі, што памешчык дасьць ім толькі па 40 кап. Бабы не згадзіліся жаць за 40 кап., пайшлі ўсе дахаты...

**«Крыўда». 1907. №26**

**Вялейскі раён.**

У раёне цяпер толькі 2—3 моцныя гаспадаркі, дзе людзі маюць прыстойныя заробкі. У астатніх працуюць як за прыгонам, амаль за так. Асабліва ўзімку, калі атрымліваюць гатоўкай па 50—60 тыс. рублёў. І саміх працаздольных на вёсцы становіцца ўсё меней. Так, у СПК імя Суворава засталося толькі 96 працаўнікоў. Перабіваюцца за кошт сваіх уласных гаспадарак і таго, што здолеюць скрасьці ў дзяржавы. Нясуць з поля бульбу, капусту, моркву, а з фэрмаў — камбікорм. З таго і жывуць.

**Наш час**

IV

**Краснае,** Вялейскага павету.

Здаўна ў нас у мястэчку кожны год спраўляюць 23 юня вечарам старадаўную Купалу. Зьбіраюцца хлопцы, дзяўчаты, маладзіцы, усе ідуць дзе-небудзь на гару альбо на сенажаць і раскладваюць агонь, пяюць песьні, іграюць на гармоніках, скрыпках і на чым хто ўмее, скачуць праз агонь, танцуюць; адным словам, весяляцца, чым і як хто хоча.

**«Не вучыцель». 1909. №27.**




**Вялейка. Прабабкі і праўнучкі.**



ЯЎГЕНІЯ МАНЦЭВІЧ

**Вялейка.**

І цяпер сьвята Купальле не забылася. Народ паціху, але шчыра напіваецца ўжо з гадзін шасьці вечара. І падцягваецца да Вяльлі паліць нарыхтаваныя загадзя па сьметніках непрыдатныя колы. Бывае, іншыя між сабой спаборнічаюць, хто большае вогнішча зладзіць. Аднойчы хлапцы не паленаваліся сьцягнуць 80 колаў — чад і смурод стаяў пасьля тры дні. Ахвочыя да прысмакаў выстройваюцца ў доўгія чэргі да імправізаваных крамак і, набыўшы патрэбнае, валяцца пад бліжэйшае кустоўе, каб спажыць напой у кампаніі іншых аматараў старадаўняга сьвята. Не забываюцца і на музыку — вел-

ізарныя калёнкі зь мясцовага ДК равуць, перашкаджаючы спаць месьцічам аж да трох гадзін ночы.

**Наш час**

V

**Мястэчка Лебедзева,** Вялейскага павету.

У нашым мястэчку за апошні час пачало вельмі шырыцца п'янства. Праўды, што і даўней нашы мужыкі ад гарэлкі не адракаліся, але ж цяпер дык так п'юць, як ніколі не бывала. Бо ж і выгода для п'янюг настала: настроілі тутака новы «тракцір» і тры «піўныя лаўкі»... Ёсьць гдзе разгуляцца: мужык астатнюю капейку цягне з хаты, кідаючы дзяцей і жонку галоднымі, і прапівае; а п'яны лезе з кожным біцца ды варочаецца дамой з разьбітай галавой, акрываўлены...

**І.С.-Д. 1907. №34**

**Вёска Хадасы,** Вялейскага раёну.

У вёсцы суцэльнае п'янства нават стварыла новую сацыяльную групу мясцовага грамадзтва. Фэномэн атрымаў назву «хадасоўскія жаніхі». Гэта мужчынскае насельніцтва недзе ад 28 да 45 год, якое праз сваю ахвоту да чаркі ня мае сям'і і жыве ці аднаасобна, ці пры сваіх старых матулях. Яны купкамі соўгаюцца па вёсцы, і пазнаць іх няцяжка нават здалёк па хадзе, бо і цьвярозыя яны кепска ладзяць з адпітымі ўшчэнт нагамі. Большасьць зь іх некалі мелі жонак і нарадзілі колькі дзетак, але жанкі здолелі іх трываць 5, а іншы раз 10 год і павыганялі прэч. У большасьці «жаніхі» ня маюць сталае працы і перабіваюцца выпадковымі заробкамі і крадзяжом. Таксама адбіраюць матульчыны пэнсіі, чынячы гвалт над старымі. Гаспадарак не вядуць, а толькі прапіваюць усё разам і з самой хатай уключна. Дажываюць такія небаракі па разваленых лазьнях ці закінутых хатах, дзе сьпяць на саломе. Часам гарaць ад недапаленай цыгаркі ці калеюць на сьмерць у зімовыя маразы.

**Наш час**

VI

**Мястэчка Парафіянава,** Вілейскага павету.

Каля нас зьявіліся нейкія нязнаемыя людзі, што радзяць мужыком ехаць на заработкі ў Сыцылію (у Італіі)... Гэтыя агенты паказваюць пазваленьне ад начальства і кажуць, што іх тутака прыслала нейкая хэўра нямецкая. Яны даюць на першы погляд быццам і добрую цэну — 40 руб. у месяц, кантрактуючы адразу на паўгоду... Сьцеражыцеся, мужыкі, бо пасьля вінавацiць будзеце самі сябе! Гэтакія прыклады ўжо ня раз бывалі. Нядаўна ў Галіцыю таксама прыехалі нейкія агенты і павязьлі мужыкоў–палякоў у Бразылію, абяцаўшы добрыя заработкі пры будове чыгункі. Але, як прышло што да чаго, дык тыя мужыкі ня толькі нічога не зарабілі, але яшчэ і галадалі...

**Пятрок Праўдурэж. 1909. №12**

**Вялейка.**

Штогод людзі рознага веку з нашага гораду выпраўляюцца на заробкі ў замежжа. І за акіян — у ЗША, і бліжэй па Эўропе — у якую Англію. Наймаюцца на некваліфікаваныя гаспадарчыя працы па ўборцы клубніцаў у Швэцыі і гэтак далей. Ад'яжджаюць у большасьці без надзейных гарантый, толькі спадзеючыся на шчасьлівы выпадак. На чужыне часта церпяць крыўды і нястачу, бо падмануць такіх ня надта дасьведчаных працаўнікоў лёгка. А найбольш непрадказальныя і небясьпечныя заробкі ў суседняе Расеі, дзе надараецца ня толькі дробная хлусьня, але і адкрытае рабаўніцтва. І болей за тое, некаторыя бедакі вяртаюцца адтуль дадому ў трунах ці наагул зьнікаюць бязь зьвестак у якой Маскве, і гадамі сваякі ня ведаюць пра іх лёс.

**Наш час**

VII

**З гуты «Залесьсе»** (ад уласнага карэспандэнта).





ЯЎГЕНІЯ МАНЦЭВІЧ

Нядаўна мне прыйшлося пабываць у тутэйшай гуце «Залесьсе», каторую завуць яшчэ Ільскай... Заработкі гутнікаў болей–меней такія бываюць: майстра бярэ паштучна і выганяе ў месяц руб. 35—50 — як каторы; памочнікі майстра бяруць падзённа 50—80 кап., адносчыкі. Формаўшчыкі (што ціскаюць форму) зарабляюць 15—20 кап. у дзень... Як бачым, найболей зарабляюць майстры, але калі ўзяць пад увагу, колькі такая праца вымае духу і ўкарачвае веку... дык тая аплата зусім малая. Але і пры ёй можна было б як–колечы жыць... каб адміністрацыя была б крышку акуратнейшай і зьвяртала ўвагу на людзей, што для яе карысьці працуюць...

P.S. Працуе ў гуце больш як 300 чалавек.

**Ня-Гутнік. 1911. №31—32**

**Пасёлак Партызанскі** (былая гута «Залесьсе»), Вялейскі раён.

Ужо некалькі год гута зусім не працуе. Адпаведна ўсе яе працаўнікі засталіся бяз сродкаў да існаваньня. Колькі ўрадавых камісій ні прыяжджала, а дапамогі ніякай так і не было. Ня ўзяўся за аднаўленьне прадпрыемства і інвэстар, што неяк наведваў Залесьсе. Жыхары зарабляюць як хто можа: частка мужыкоў працуе на невялікім тартаку, некалькі дзясяткаў жанчын штодзень езьдзяць пад Менск на нейкае прадпрыемства чысьціць і парадкаваць рыбу, а бальшыня перабіваецца з таго, што трымае ўласныя гаспадаркі ды ўсё лета зьбірае па лясох грыбы зь ягадамі. Пасьля з кошыкамі і вёдрамі стаяць яны абапал дарог, каб што прадаць і выручыць капейчыну. Людзі страцілі ўсе надзеі на лепшае.

**Наш час**

VIII

**Мястэчка Радашкавічы,** Вялейскага павету.

Як даведалась рэдакцыя, адкрываецца скора Прыходзкае вучылішча з двумя клясамі. На гэта з казны будзе ісьці па 1470 руб. штогод. Будуць два вучыцелі; поп і ксёндз будуць навучаць рэлігіі; рэлігіі вучыцца могуць дзеці ў сваёй роднай мове... хто

**Працяг на старонцы 26.**

**Працяг са старонкі 25.**

# Навіны даўнія і сёньняшнія

скончыць прыходзкае, таго будуць прымаць у першы кляс гарадзкога вучылішча, каторае мае таксама адкрыцца...

**Я.Птушка. 1907. №28**

**Вялейскі раён.**

У раёне штогод закрываецца па некалькі школ у сельскае мясцовасьці. Зь сярэдніх робяць няпоўныя базавыя, а то і пакідаюць толькі пачатковыя. Няма на іх ні настаўнікаў, ні дзяцей, ні грошай на належнае падтрыманьне працы. Будынкі школаў, садкоў і бібліятэк стаяць забітыя наглуха цьвікамі. Каб неяк укамплектаваць астатнія, ўлады выдаткавалі фінансаў на школьныя аўтобусы, што звозяць настаўнікаў і малых з 10—15 навакольных вёсак ў адну незакрытую школу. У Хаценчыцах быў выпадак, як узімку зламаўся такі аўтобус, і настаўнікі ўжо не чакалі вучняў на заняткі, бо было дужа зімна, шмат сьнегу ды і адлеглась не малая. Было дзіва, калі, хаця і са спазьненьнем, але амаль усе дзеці (74 чалавекі, прычым 11 з аднае сям'і) дабраліся ў школу сваёй хадой. Матывам жа такога ўчынку было жаданьне дзяцей трапіць на гарачы школьны абед, бо ў бацькоў, што ня маюць працы ды моцна п'юць, апроч бульбы ды капусты нічога няма, а тут на дэсэрт яшчэ давалі й цытрыну.

**Наш час**

IX

**Мястэчка Даўгінава,** Вялейскага павету.

...Цяпер пабудавалі піваварню ў нас у мястэчку. Той, хто будаваў піваварню, хоча зрабіць канкурэнцыю віленскай і докшыцкай піваварням дый разбагацець на гэтым...

**В.Сос-кі. 1910. №41**

**Мястэчка Даўгінава,** Вялейскага павету.

Вульф Сосенскі залажыў вялікую швальню і вучылішча кравецтва, — прыймае ўчанікоў, вучыць англіцкай і нямецкай рабоце. Скончыўшым у яго навуку выдаецца сьвядэцтва.

**1910. №16—17**

**Мястэчка Даўгінава,** Вялейскага павету.

Летась Юдка-шавец, можна сказаць, галава на ўсё мястэчка, намовіў мяшчан, каб зрабілі бойню. Падалі прашэньне губэрнатару; сёлета прыйшло ўжо пазваленьне...

**В.С-кі. 1910. № 31**

**Мястэчка Даўгінава,** Вялейскага павету.

...У прошлым гаду адкрылася ў нас і кнігарня... Глыбоцкі жыд, каторы прывёз з Амэрыкі, як кажуць, больш за 10 тысяч грошай, прыехаў у Даўгінава і будуе тут фабрыку ўсялякага печыва. Цяпер ужо муруюць печ...

**В.Сос-скі. 1910. №4**

**Даўгінава**, Вялейскага раёну.

На наш час нічым Даўгінава не прырастае. У больніцы колькасьць ложкаў паменела ўдвая, моладзь зьбягае ў горад. Няма ня тое што свайго піва ці печыва, але і хлеб завозяць здалёк. Шкада, што дзяржава замест таго, каб падтрымаць прадпрымальніцтва і прыватную ініцыятыву, якія маюць тут гэткія слаўныя традыцыі, і тым самым вярнуць жыцьцё мястэчку, адбудавала паводле разнарадкі сумнеўна патрэбны аграгарадок.

**Наш час**

X

**Мястэчка Даўгінава,** Вялейскага павету.

Даўно ўжо не было ў нашым мястэчку такога кірмашу (7 мая), як сёлета. Таргавалі добра, а найбольш манаполькі. Торг скончыўся: стражнікі і ўраднікі гарцавалі па вуліцах і выпраўлялі гуляк дахаты «па-добраму». У мужыка Гайлы — зь вёскі Субачы, укралі зэгарэк за 18 руб. Цяпер і без зэгарка ён будзе добра помніць гэту гадзіну...

**В.С-кі**

**Вялейка**

Кірмашы хай сабе і ня колішнія, але ж і мы цяпер маем. Гандаль ідзе, і чарку пры ім узяць можна. А што да бяды спадара Гайлы (дарэчы, нашага далёкага сваяка), то можам адно сказаць, што і мы мелі нядаўна падобную непрыемнасьць: зпад акна белым днём скралі ў нас добры ровар памаранчавага колеру. Жыцьцё ідзе!

**Наш час**

**Адказвалі карэспандэнтам «НН» стогадовае даўніны Сьцебуракі Мікола і Ўсевалад**



**Над Вяльлёй.**




ЯЎГЕНІЯ МАНЦЭВІЧ

# Швайцарскі футбол

## ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ

Алег Блахін, трэнэр зборнае Ўкраіны, за некалькі хвілінаў да сэрыі пасьляматчавых пэнальці, на якіх павінна было вырашыцца, ці выйдзе ягоная каманда ў чвэрцьфінал, у час, калі памочнікі мітусіліся вакол футбалістаў асноўнага складу з нататнічкамі, а запасныя гульцы нэрвова грызьлі пазногці, нечакана пакінуў трэнэрскае крэсла і пайшоў у распранальню пад трыбунамі.

У манастырскай цішы распранальні было халаднавата. Ён накінуў камзол, скінуў абрыдлыя «адыдасы», надзеў батфорты, што стаялі ў куце, са століка-бару ўзяў бутэльку к’янці, наліў сабе поўны келіх і сеў за дубовае бюро. Абмакнуў гусінае пяро ў чарнільніцу і вывеў на па-шляхетнаму жаўтаватым аркушы: «Трактат аб швайцарскім футболе».



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Пасьля абавязковых у такіх выпадках рэвэрансаў у бок кіраўніцтва ФІФА і ўкраінскага імпэратара, ён коратка распавёў пра асноўныя вяхі швайцарскай гісторыі, засяродзіўшыся трохі больш на дваццатым стагодзьдзі. У прыватнасьці, ён у найвышэйшай ступені выказаўся аб швайцарскім нэўтралітэце і падкрэсьліў выключную ролю Швайцарыі ў стварэньні міжнароднага Таварыства Чырвонага Крыжа. Потым зрабіў трыдыцыйную паралель паміж футболам ды жыцьцём і нарэшце дабраўся да сутнасьці трактату. «У швайцарскага футболу, — пісаў Алег Блахін, — як, дарэчы, і ў швайцарскага хакею,— адна праблема. Іх поўная, татальная беспэрспэктыўнасьць».

«Як мы ведаем, — працягваў уладальнік «Залатой Буцы», — за радасьцю перамогі ідзе расчараваньне паразы, і футбольнае жыцьцё — бясконцае іх чаргаваньне. І гэта датычыць усіх без вынятку камандаў. Розьніца толькі ў тым, — дадала супэрзорка сусьветнага футболу, — што калі некаторым зборным падчас сьветлай паласы перамог, дзякуючы якасьцям, якія выпрацоўваліся іх нацыямі стагодзьдзямі, можа пашчасьціць заняць высокае месца ў турніры, дык іншым, гэтаксама «дзякуючы» іх нацыянальным якасьцям, нават пры ўсіх усьмешках фартуны, — ані блізка. Таму бразыльская нязмушанасьць, нямецкая зладжанасьць або ўкраінская ўпартасьць маюць усе шанцы (пры памысным зьбегу акалічнасьцяў, зразумела) занесьці зборныя гэтых краін на грэбень посьпеху. А вось швайцарская бесстароннасьць, швайцарская пунктуальнасьць, да жалю, — не зусім тыя рысы, якія патрэбныя ў змаганьні за мяч. І таму швайцарская зборная ніколі, нават у спрыяльны для сябе час, ня здолее ўзьняцца на вяршыню футбольнага Алімпу. Швайцарскім зборным будучыні наканавана біцца сваёй зусім не дурной галавой аб сьценку і толькі час ад часу бачыць аблудны цень надзеі ў выглядзе асобных перамог у адборачных турнірах».

«Аднак, трэба заўважыць, — выводзіў уладальнік Кубку кубкаў і Супэркубку, — што Швайцарыя, якая ў іншых галінах мае багаты досьвед пільнаваньня нэўтралітэту і бесстароннасьці, магла б напоўніцу выкарыстаць гэты патэнцыял і стаць злучальным мастком паміж супернікамі і ў футболе. Трэба, — а ў выбітнага кіяўляніна не было на гэты конт ані найменшага сумневу, — ведаць сваю нішу і карыстацца ейнымі перавагамі».

Далей у сваім трактаце Алег Блахін далікатна прапанаваў швайцарскаму каралю адмовіцца ад удзелу ў чэмпіянатах і іншых турнірах ды перакваліфікаваць усіх без вынятку швайцарскіх футбалістаў у футбольных судзьдзяў. «І менавіта ў гэтым рамястве будуць запатрабаваныя пералічаныя вышэй якасьці швайцарскай нацыі, — натхнёна пісаў сяміразовы чэмпіён СССР. — І менавіта на гэтым шляху яе чакае сусьветнае прызнаньне. Зь цягам часу ўвесь сьвет адмовіцца ад паслуг арбітраў— прадстаўнікоў іншых краінаў ды пяройдзе на швайцарскіх, ды швайцарскі судзьдзя будзе цаніцца гэтаксама высока, як швайцарскі гадзіньнік або швайцарскі складанчык».

Блахін не абмінуў сваёй увагай і недахопаў намаляванай ім пэрспэктывы. Ён зазначыў, што швайцарцы, выконваючы абавязкі выключна «судзьбовыя», вядома, будуць пазбаўленыя шанцу паспытаць смаку перамогі. «Але зь іншага боку, яны ніколі не зазнаюць паразы», — адцеміў былы форвард кіеўскага «Дынама». Да таго ж, дзякуючы свайму надзвычайнаму прафэсіяналізму, швайцарскія судзьдзі здолеюць заваяваць сымпатыю ды будуць мець пашану да сябе мільёна футбольных заўзятараў ва ўсім сьвеце. Прыплюсуем да гэтага акрыляльнае адчуваньне абранасьці, калі ты судзіш учынкі іншых. «У разумных межах эўрапейскага лібэралізму, вядома», — дадаў лепшы бамбардзір за ўсю гісторыю савецкага футболу.

Са столі пасыпаўся пабел, і данеслася кананада саракатысячнага натоўпу. Відаць, нехта рэалізаваў пэнальці. Блахін заплюшчыў вочы. Яму ўявіўся стадыён футбольнай школы Цюрыху, дзе сотні маленькіх хлопчыкаў у чорных майках адпрацоўваюць прызначэньне адзінаццацімэтровага ўдару ды па-над пляцоўкай стаіць гуд дзясяткаў арбітарскіх сьвісткоў.

Блахін расплюшчыў вочы і завяршыў трактат рытарычным пытаньнем: «Нашто быць дзясятымі ў лізе сусьветнай, калі ў сваёй, уласнастворанай лізе судзьдзяў можна быць багамі... альпійскімі багамі?»

Дапісаўшы апошняе слова свайго трыццацістаронкавага трактату, Блахін паклаў пяро на адмысловы беражок бурштынавага прэс-пап’е і зноўку заплюшчыў вочы. Але тут у распранальню ўварваўся змакрэлы, апрануты ў жоўта-блакітны касьцюм памочнік галоўнага трэнэра. Рухаючыся, ён сьпехам насоўваў белы, шчодра абсыпаны пудрай, парык. Усё ж абмінуўшы абавязковы ў гэтых выпадках кніксэн, памочнік узрушана загарлаў:

— Васпан! Бацька Блахін! Віват! Бітва пад Кёльнам скончылася перамогай! Яны не забілі ніводнага пэнальці!

Падкоўкі на батфортах Блахіна пераможна цокнулі.

## ТЭАТРЫ

**Балет**

**13 (пт), 14 (сб)** — «Беласьнежка і сем гномаў».
**16 (пн)** — «Сонная прыгажуня».
**18 (ср)** — «Любоў пад вязамі».

**Опэра**

**14 (сб)** — «Набука».

**Купалаўскі тэатар**

**22 (ндз)** — «Паўлінка».
*Малая сцэна*
**20 (пт), 21 (сб)** — «Варшаўская мэлёдыя».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**13 (пт), 19 (чц)** — «Шлях у Царград».
**14 (сб)** — «Парадоксы жарсьці».
**14 (сб)**, на сцэне Дому літаратара (ДЛ) — «Воўк-мараплавец».
**16 (пн)**, на Малой сцэне Палацу рэспублікі (ПР) — «Адвечная песьня».
**17 (аўт)** — «Валянціна» (ПР).
**17 (аўт)** — «Адэль» (ДЛ).
**18 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі» (ПР).
**18 (ср)** — «Нязваны госьць» (ДЛ).
**19 (чц)** — «Палёты з анёлам» (ПР).

**Тэатар юнага гледача**

**13 (пт), 21 (сб)** — «Залатое сэрцайка».
**13 (пт)** — «Рыцар Ордэну Сонца».
**14 (сб)** — «Тая, што стварыла цуд».
**14 (сб)** — «Апошняя дуэль».
**15 (ндз)** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**18 (ср)** — «А золкі тут ціхія».
**19 (чц)** — «Сястра мая Русалачка».
**20 (пт)** — «Каліф-шавец».
**21 (сб)** — «Шлях на Бітлеем».
**22 (ндз)** — «Пацалунак ночы».

**Тэатар лялек**

**14 (сб)** — «Дом, які пабудаваў Суіфт».
**15 (ндз)** — «Чароўная лямпа Алядына».
**17 (аўт)** — «Чараўнік Смарагдавага гораду».
**18 (ср)** — «Прыгоды бравага ваякі Швэйка».
**20 (пт), 21 (сб)** — «Сіняя птушка».
**22 (ндз)** — «Прыгоды Пін-Піна».

## ПРЭЗЭНТАЦЫІ

**Пабачыць сьвет**

**18 кастрычніка** а 18-й у Музэі імя Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) мае прайсьці прэзэнтацыя кружэлкі Тацяны Беланогай «Пабачыць сьвет». Уваход вольны.

**Тэксталёгія**

**17 кастрычніка** а 16-й у Літаратурным музэі Янкі Купалы (вул.Купалы, 4) пройдзе прэзэнтацыя кнігі супрацоўніцы Інстытуту літаратуры НАНБ Э.Золавай «Тэксталёгія — мая прафэсія: З вопыту падрыхтоўкі да выданьня збораў твораў клясыкаў беларускай літаратуры».

## ВЫСТАВЫ

**Сучасныя беларускія мастакі**

У мастацкай галерэі «ЛяСандрарт» (вул.Раманаўская слабада, 24) **да 21 кастрычніка** — выстава жывапісу «Сучасныя беларускія мастакі». Творы Ўл.Шапялевіча, І.Кліменкі, М.Басава, Ул.Кожуха, С.Сялецкага, Зьм.Сурыновіча, С.Крыштаповіча.

**«Паралелі»Цехановіча**

У галерэі мастацтваў «Nova» (вул.Харужай, 16) да 10 лістапада працуе фотавыстава Альбэрта Цехановіча «Паралелі». Усе фатаграфіі выкананыя ў аўтарскай ручной тэхніцы на чорна-белай жэлятынава-срэбранай фотапаперы.



# Шалкевіч прызямліўся

**15 кастрычніка ў канцэртнай залі «Менск» (Малая заля) — вялікі сольны канцэрт Віктара Шалкевіча і прэзэнтацыя яго новага альбому «Гарадзенец прызямліўся ў Менску». Пачатак а 19-й. Кошт квіткоў 8 000—14 000. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25**

## КАНЦЭРТ

**Фольк/Pagan Fest «Пятніца. 13»**

**13 кастрычніка** ў клюбе STEP (вул.Прытыцкага, 62) пройдзе Фольк/Pagan Fest «Пятніца. 13». Удзел бяруць: Guda, Znich, «Літвін Троль», Soncavarot, «Камаедзіца» ды інш. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25. Квіткі: пераход Я.Коласа. Кошт квітка: 10 000.

## КАІСА

# У падважаным стане

Шахматная кампазыцыя сатканая з парадоксаў: у ёй перапляпаюцца лёгіка й фантазія, рэглямэнтацыя й анархія. Кампазытары, нібыта прызнаныя ФІДЭ, застаюцца «малодшымі братамі» практычных гульцоў. З шасьцю відамі фігур на 64-клеткавай дошцы можна стварыць пекныя творы… пекнату якіх зразумее хіба адзін шахматыст зь пяці.

Ад пачатку XX ст. у сьвеце робяцца спробы павялічыць разнастайнасьць варыянтаў шляхам увядзеньня незвычайных фігур і памераў дошкі (г.зв. казачныя шахматы з «зэбрамі», «вярблюдамі», «бізонамі»). Каштоўнасьць шмат якіх навінак бяруць пад сумнеў самі складальнікі. Калі верыць майстру Аляксандру Булаўку, ён расчараваўся ў галіне, якую дэ-факта запачаткаваў у Беларусі: «Казачнікаў» вельмі мала, і кампазытары ставяцца да іх, акурат як практыкі да кампазытараў.

Нямала гадоў у асяродзьдзі стваральнікаў этюдаў і задач лунае ідэя самавызначэньня: выхаду зь Беларускай фэдэрацыі шахмат або, прынамсі, разбудовы аўтаномнай асацыяцыі. У траўні 2006 г., пасьля першынства рашальнікаў, фактычна ігнараванага БФШ (гл. «НН», №20), ідэю падхапіў і патрыярх беларускіх праблемістаў, 70-гадовы Ўладзімер Сычоў.

Зрэшты, прапанова сп.Сычова папахадзіць па кабінэтах сустрэла пэўны скепсіс з боку калегаў. «Цяперашняя рэдакцыя закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях наўрад ці спрыяе такому кроку», — зазначыў Васіль Зелянкоўскі, чыгуначнік, які спрабаваў пасадзіць кампазытараў у «асобны цягнік» гадоў 15 таму. Ня лічыць учасный ідэю і рэдактар самвыдавецкіх кампазытарскіх пэрыёдыкаў Вадзім Жылко: «Можа, некалі замацуецца заяўны прынцып стварэньня грамадзкіх арганізацыяў, тады будзе прасьцей».

Выглядае, клімат у краіне гняце ўсіх, хто прагне якой-кольвечы канструктыўнай працы. Ня дзіва, што традыцыйны вобраз шахматных кампазытараў — «ізаляваныя дзівакі» — праз намаганьні ўладаў ператвараецца ў вобраз непадкантрольных беларускіх творцаў. То не дамо замкнуць сябе ў гета!

**ВР**

**Рашэце задачу**

Зьміцер Жылко, 2006. Мат за 2 хады. Публікуецца ўпершыню.



**Адказ:** 1. Крf8! з пагрозай 2. Кd3Х. Падманлівыя спробы: 1. Сd3? Кd3, 1. Крg8 Фс4+. Зьміцер (не Віталь) разам з братам выступіў і ў згаданым першынстве рашальнікаў.

# Два гады віртуальнага каханьня

**Дом ля возера** (Lake House).

ЗША, 2006, каляровы, 105 хв.

**Жанр:** мэлядрама з элемэнтамі фантастыкі.

**Адзнака:** 4 (з 10).

Доктар Кейт, якая жыве ў доме ля возера, сустрэла, нарэшце, мужчыну сваёй мары. Ён таксама жыве... у доме ля возера, але за два гады да самой Кейт. Сродкам сувязі паміж закаханымі становіцца старая паштовая скрыня, якая спраўна перапраўляе лісты з 2006 у 2004 год. Але сустрэцца героям праблематычна...

Пашаноўная гісторыя вандраваньняў у часе становіцца на службу сьлёзавыціскальнае мыльнае опэры. Мужчыне й жанчыне перашкаджаюць ня злосныя інтрыганы, а сам час. Застаецца чакаць і спадзявацца.

Кіяну Рыўс (архітэктар Алекс) — рамантычна-задумлівы, няголены, стрымана-мэлянхалічны. Сандра Балак (доктар Кейт) — самотная, эмацыйная й працагалічная. Апошнюю кропку ў ейных бядотах ставіць няўдалы жаніх, які просіць зрабіць цішэй тэлевізар з «мылядрамаю», чым ушчэнт разьбівае жаночае сэрца.

Карціна — ідэальнае відовішча для дзяўчынак, хаця віртуальна-рамантычная гісторыя й падаецца вялай і ватнай.

Фільм ёсьць паўторам карэйскае стужкі «Siworae».

Шкада, што нам не паказалі арыгіналу.

Сэансы ў Менску з 10 па 15 кастрычніка:

«Аўрора» — аўторак, серада 18.30, 20.30, 21.40; чацьвер—нядзеля 21.40.

# Німфа ў чаканьні Тартуцікаў

**Дзяўчына з вады** (Lady in the Water).

ЗША, 2006, каляровы, 110 хв.

**Жанр:** сямейны казачны трымценьнік.

**Адзнака:** 3,5 (з 10).

Цельпукаваты камунальнік знаходзіць у басэйне агульнага карыстаньня німфу. Водная дзяўчына зьявілася ў наш сьвет, каб абудзіць да творчасьці аднаго пісьменьніка, але ня ведае, каго менавіта. Камунальнік распачынае вышукі, а казачную істоту перасьледуе містычны сабачка…

Ад аўтара «Шостага пачуцьця» Ш'ямалана ўсе чакаюць трымценьня і жахаў, але на экране — разгубленая казка. Прычым абцяжараная містычнай перадвызначанасьцю і мэсіянскімі намінкамі (ролю пісьменьніка-мэсіі Ш'ямалан сыграў сам).

Абяцаныя Тартуцікі, хоць і зьявіліся, аўдыторыю ўразіць не патрапілі.

Сэансы ў Менску з 10 па 15 кастрычніка:

«Дом кіно» 19.00;

«Перамога» — аўторак, серада 14.30, 16.40, чацьвер, пятніца — 16.50, субота, нядзеля — 14.50 (ільготны).

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**СТРАШНЫ СУД** (Day of Wrath). Гістарычны дэтэктыў, Вялікая Брытанія—Вугоршчына, 2005, рэж. **Эдрыян Рудамін.**
У ролях: **Крыстафэр Ламбэрт, Бланка Марсылах.**
Гішпанія, XVI ст. Шэрыф (Крыстафэр Ламбэрт) дасьледуе забойствы шляхты ў правінцыйным мястэчку. Многія лічаць злачынствы справаю сатаны. Ці здолее герой знайсьці праўду, пакуль горад не пакарала інквізыцыя?..
**Менск, Кісялёва, 12. Т.: 643-21-08**




## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 14 кастрычніка

**НТВ, 13.55**

«Рабыня каханьня».

Расея (СССР), 1975, рэж. Мікіта Міхалкоў.

Мэлядрама.

Грамадзянская вайна. Зорка нямога кіно Вольга Вазьнясенская на здымках у правінцыйным гарадку. Гераіня ня здольная ні прыняць зьмены, ні ўцячы ад іх. Мо дапаможа каханьне? Але ў рукі гераіні трапляюць кадры крывавае калатнечы...

Савецкае прывітаньне дарэвалюцыйнаму нямому кіно. Выкшталцоныя кадры Паўла Лебешава, музыка Эдуарда Арцем'ева — і безабаронная Алена Салавей з апошнім крыкам: «Панове, вы зьвяры!»

**«Лад», 20.30**

«Новае адзеньне імпэратара».

Італія—Вялікабрытанія—Нямеччына, 2001, рэж. Алан Тэйлар.

Камэдыя.

1821 год. Змоўнікі-банапартысты зьбіраюцца падмяніць зьняволенага Напалеона двайніком. Пад выглядам марака Эжэна Ленармана ён выпраўляецца ў Парыж, а сам п'яніца Ленарман займае месца Напалеона на высьпе Сьвятой Алены. Але двайнік уваходзіць у ролю былога імпэратара, а самому Напалеону ніхто ня верыць. Парыскія вар'ятні перапоўненыя напалеонамі...

У галоўнай ролі Ян Голм («Пяты элемэнт»).

Прыз глядацкіх сымпатый на кінафэсьце ў Флорыдзе.

**БТ, 21.40**

«Матч пойнт».

ЗША—Вялікабрытанія—Люксэмбург, 2005, рэж. Вудзі Ален.

Драма.

Змрочна-вытанчаная драма ад камэдыёграфа Вудзі Алена, якая прымушае ўзгадаць Драйзэра й Дастаеўскага. Выпадак, жарсьці, трагедыя без пакараньня — і геніяльная акторская гульня (Скарлет Ёхансан і Джонатан Рыс Маерз).

Прэміі «Давід» і «Гоя» за найлепшы эўрапейскі фільм, намінацыі на «Залаты глёбус» і яшчэ шэраг узнагародаў.

**НТВ, 23.00**

«Малхоланд драйв».

ЗША—Францыя, 2001, рэж. Дэйвід Лінч.

Трызьненьнік-дэтэктыў.

Дзяўчына са згубленай памяцьцю абірае сабе імя Рыта і з дапамогай актрысы Бэці спрабуе разгадаць таямніцы...

Фірмовы лінчаўскі стыль, цягучая музыка, корсткія актрысы (Наомі Ўотс і Лора Хэрынг) — і загадкі, ад якіх вар'яцее глядач.

### Нядзеля, 15 кастрычніка

**НТВ, 17.10**

«Канікулы спадара Юло».

Францыя, 1953, рэж. Жак Таці.

Дзівак Юло прыяжджае ў Брэтонь адпачыць — і праз сваю нязграбнасьць усяляк перашкаджае курортнікам.

Намінацыя на «Оскара» за сцэнар.

**БТ, 22.25**

«Олдбой».

Паўдзённая Карэя, 2003, рэж. Парк Чан Вук.

Псыхалягічны трымценьнік.

Чалавека скрадаюць і 15 гадоў трымаюць у няволі. Потым нечакана вызваляюць. Герой апантаны нянавісьцю — і жадае дакапацца праўды.

Крывава-паэтычная звышжорсткая харэаграфія ад Парк Чан Вука. Прыз на Канскім фэсьце з рук Квэнціна Таранціна.

**Андрэй Расінскі**

# Дзякуй

**Г.Л., Тамары М., К.М., Натальлі Б., А.К., А.Ф.** з Горадні.

**Ганьне Р.** з Валожынскага раёну.

**Ірыне З.** з Жодзіна.

**Канстанціну К.** з Рэчыцы.

**Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.

**Канстанціну С., Любові Ш., Аляксандру Л., Леаніду С.** зь Віцебску.

**Сяргею А.** з Клімавіцкага раёну.

**Людміле Р.** з Капыльскага раёну.

**Сяргею В., А.С., Аляксандру П., Стэфану Н.** з Наваполацку.

**Віктару С.** з Ваўкавыскага раёну.

**Ларысе Р.** з Калінкавічаў.

**Сяргею Ц.** зь Лепельскага раёну.

**А.П.** са Жлобіна.

**Ігару Б.** з Воршы.

**І.Дз.** з Гарадзенскага раёну.

**Веры Ч., Валеру Б., А.П., Сяргею А., Аляксандру К.** зь Берасьця.

**Георгію Р.** з Баранавічаў.

**А.М.** з Кобрынскага раёну.

**Інэсе В.** з Аршанскага раёну.

**Л.Ц., Сьвятлане К., Сяргею Ч.** зь Ліды.

**С.Г.** зь Вялейскага раёну.

**Фёдару Ю.** з Талачынскага раёну.

**Натальлі І.** з Пухавіцкага раёну.

**Мікіце Б., А.К., Леаніле Г.** зь Менскага раёну.

**У.С., Мікалаю Х., Дзьмітрыю П.** з Гомелю.

**Паўлюку С.** з Горацкага раёну.

**Канстаціну Ш.** з Докшыцкага раёну.

**Вячаславу К.** з Барысава.

**А.К.** зь Пінску.

**Юр'ю М.** з Кармянскага раёну.

**В.К.** з Полацку.

**К.Ш.** з Браслаўскага раёну.

**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.

**Тарэсе Р., Інэсе Н., Фёдару К., А.Ш., А.Б., І.С., Яўгеніі Я., Паўлу Б., М.Ш., Мікалаю У., Ю.М., Зьмітру Н., Т.М., А.Л., Аляксандру Н., Генадзю Б., Сьвятлане З., Вадзіму В., Багуславу У., Яўгену К., Сяргею А., В.З., Аляксандру Ж., Марыне Б., Віталю С., Генадзю Р., Натальлі Г., Рыгору М., Натальлі М., М.С., Тацяне К., Кастусю Л., Л.Ж., Сьвятлане К., С.Т., Ірыне Г., Сяргею П., А.С., Генадзю Б., Натальлі А., А.А., Юр'ю М., Міхалу С., Натальлі Г., Мікалаю С., Уладзімеру Ш., Уладзіславу Ж., В.П., Д.К., В.Г., Валеру Ш., Вользе Я., А.Д., Марыі Б., С.Ж., А.Р., Анатолю К., Зьмітру Н., Уладзімеру Я., Марыне У., Мікалаю П., Ігару Г., Яўгену К., Людміле К., Валянціне З., Аляксандру Ш., Аляксандру Н., Тамары Т., Анатолю С., Іраідзе З., Але С., Альберту С., Уладзімеру Ж., Тамары К., М.Б., Марыі Г.** зь Менску.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.
М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.
С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпе-чаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.



**...сярод прызэраў «Дажынак» была асоба, якой хранічна ня шчасьціла.**

— Прабач, мілая. Сёлета я зноў намалацію толькі на трэцяе месца і зноў атрымаў кампутар.

**...хада найноўшай гісторыі Беларусі адпавядала яго словам.**

— Па-вашым пранонсе я бачу, што вы беларус расейскага паходжаньня. Раю вам набыць гэты чамадан. На ім вельмі зручна сядзець.



## Сяргей Лаўроў: Польская меншасьць у Беларусі — як расейская ў Латвіі



Міністар замежных справаў Расеі нечакана ўзьняў справу польскай меншасьці ў Беларусі. **Старонка 8.**

## Міліцыянты прыйдуць да кожнага беспрацоўнага



Пасьля ўліку працоўных рэсурсаў з дармаедамі пачнуць разьбірацца. **Старонка 8.**

## «Усе кнігі Сіпакова мусяць быць зьнішчаныя»




Кіраўнік «Харвесту»: «Інцыдэнт адбыўся, бо мы ня ведалі, што знак «Кнігазбору» зарэгістраваны». **Старонка 9.**

### У НУМАРЫ

## Дажынкі 2006 гадоў да н. э.



Гумарэска Лёліка Ушкіна. **Старонка 17.**

## Юшчанка як Гамлет



Прычына паразы рэвалюцыі хаваецца ў асобе ўкраінскага прэзыдэнта, а надзея — у дзейнасьці пазапарлямэнцкіх сілаў і прэсы. Піша Багдан Асадчук. **Старонка 23.**

## Сабака і Граждан на 100-годзьдзі «Нашай Нівы»

Адзін Сабака прыйшоў на прэзэнтацыю кнігі Фядуты. Граждан, убачыўшы Сабаку, сказаў: «А я думаў, што вас даўно блохі заелі!»

***

Аднаму Сабаку далі слова. І той прызнаўся, што ён пераапрануты Граждан.

***

Аднаму Сабаку спадабалася прэзэнтацыя, бо можна было купіць кнігі. Граждану — не спадабалася, бо яму хацелася выпіць і закусіць вудзяла.

***

З адным Сабакам павітаўся Фядута. Граждану таксама хацелася ўвагі, і ён падбег да Фядуты і сказаў: «Напішэце і пра мяне. Я Шніпа не люблю...»

***

Адзін Сабака сядзеў у залі і драмаў, і толькі калі выйшаў выступаць Граждан, пераапрануты ў Шніпа, прачнуўся і сказаў: «Няўжо я рэвалюцыю праспаў?»

**ВШ**


# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**




Дарагому **Адасіку** Карцаву **шлюць** вітаньні Якуб і Юстынка. Трымайся, дружа, мы з табою!


### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**РЭПЭТЫТАР**

**Шукаю** рэпэтытара лаціны. Т.: 704-01-87. Алесь

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**15 кастрычніка** (нядзеля) па маршруце: Менск — Беніца — Крэва — Баруны — Гальшаны — Вішнева — Дзясятнікі — Валожын — Менск. **21 — 22 кастрычніка**: Вільня — Трокі — Меднікі. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16

**КВАТЭРА**

**Два сьвядомыя беларусы** здымуць 2-пакаёвую кватэру на працяглы тэрмін. SMS з прапановамі дасылайце на нумар (+37529) 577-73-13


Рэдакцыя часопісу «ARCHE» смуткуе разам зь Сяргеем Зікрацкім аб сьмерці жонкі Кацярыны.

Работнікі «Нашай Нівы» шчыра спачуваюць Сяргею Зікрацкаму з нагоды заўчаснай сьмерці жонкі.

РГА «Беларускі ПЭН-Цэнтар» выказвае спачуваньні Сяргею Зікрацкаму з нагоды сьмерці жонкі.

### «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Неспадзяваная сьмерць прадсядацеля міністраў, П.А.Сталыпіна, паказывае йшчэ адзін лішні раз, што гасударсьцьвеннае жыцьцё не апіраецца і ня можа апірацца на адным чалавеку, хаця б ён і быў і дужы, і здольны, хаця б уся ўласьць была ў яго руках: жыцьцё гасударства разьвіваецца паводлуг жалезных законаў, створаных сталецьцямі. Вось чаму і пасьля сьмерці Сталыпіна ўсё ідзе далей сваім парадкам, быццам-то нічога і не прылучылася.

**«Наша Ніва». 1911. №37—38**


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.

Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 11.10.2006.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.